ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 33-і
№ 16 (1965)
23 лютага 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЁННЯ — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ

С. ШУШКЕВІЧ

РАКЕТЫ СПЯЦЬ

Мы ўзялі плуг, а для сахі
Жыццё глыбокі дол капала.
Пра порах пелі мы сухі,
А сэрца мірны лад чакала.

Ад старасвецкае сахі
Ішлі да новага арала...
Пра порах пелася сухі,
А вораг рынуўся з напалмам.

Дзе зерне мірна без трывог
Да сонца парастак пусціла,
Вайны бязлітаснай нарог
Скапаў жыццё пякельнай сілай.

Хіліла маці галаву
Над невядомаю магілай,
Але ж няшчасную ўдаву
Вайна дашчэнту не скарыла.

Знайшла ў сабе святую моц
За сына помсціць і за мужа.
Арала поле дзень і ноч,
Касіла, жала, ткала кужаль.

Хто ж мог ёй, беднай, спагадаць
І зразумець яе трывогу.
Яна ж ўсё змагла аддаць
За нашу славу, перамогу.

Бывае, смутак зноў мігне,
Крануцца сэрца боль і мука,
Старая ўспомніць аб вайне
І пра свайго салдата-ўнука.

Граніцу сцэражэ, спакой,
Любоўю нашай ён сагрэты,
І насцярожанай рукой
Вартуе сон цяжкіх ракетаў.

Ракеты спяць. Іх не кране
Унук, бо мір на свеце дораг.
Але заслоніць ён вайне
Дарогі з сушы, з неба, з мора.



У Мінску адбыўся заключны канцэрт агляду мастацкай самадзейнасці Беларускай ваеннай акругі.
На здымку — сцэна з вакальна-харэаграфічнай кампазіцыі «Брэсцкая крэпасць». Фота Ул. КРУКА.

ЗАГАД МІНІСТРА АБАРОНЫ СССР

23 лютага 1965 г. № 40 г. Масква

Таварышы салдаты і матросы, сяржанты і старшыны!
Таварышы афіцэры, генералы, адміралы і маршалы!
Ветэраны арміі і флоту, якія знаходзяцца ў запасе і адстаўцы!

Сёння савецкі народ святкуе 47-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Гэта свята народы СССР адзначаюць далейшым павышэннем актыўнасці ў працы на карысць роднай Айчыны. Пастаянныя клопаты партыі аб умацаванні эканамічнай магутнасці Савецкай дзяржавы, аб павышэнні жыццёвага ўзроўню народа натхняюць працаўнікоў горада і вёскі на датэрміновае завяршэнне сямігадовага плана, на новыя слаўныя справы ў імя перамогі камунізма.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад, выражаючы волю ўсяго савецкага народа, настойліва змагаюцца за ўмацаванне міру як неабходнай умовы будаўніцтва камунізма. Разам з тым, улічваючы агрэсіўныя падкопы імперыялістаў, яны робяць усё, каб і ў далейшым умацоўваць Узброеныя Сілы, забяспечваць бяспеку нашай сацыялістычнай Радзімы, усіх краін сацыялістычнай садружнасці.

Савецкія воіны, цесна згуртаваныя вакол Камуністычнай партыі, надзейна ахоўваюць мір і бяспеку будаўніцтва камунізма, пільна стаяць на варце дзяржаўных інтарэсаў Савецкай Айчыны.

Таварышы салдаты і матросы, сяржанты і старшыны!
Таварышы афіцэры, генералы, адміралы і маршалы!
Ветэраны арміі і флоту, якія знаходзяцца ў запасе і адстаўцы!

Віншую вас з усенародным святам — 47-й гадавінай Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту!

Воіны арміі і флоту! Нястомна ўдасканальвайце сваё ваенныя і палітычныя веды, настойліва авалодвайце даверанай вам баявой тэхнікай і зброяй, строга выконвайце патрабаванні ваеннай прысягі і воінскіх статутаў, усямерна ўмацоўвайце дысцыпліну, арганізаванасць і парадак, павышайце пільнасць і баявую гатоўнасць!

У азнаменаванне 47-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту ЗАГАДВАЮ:

Сёння, 23 лютага, зрабіць салют у сталіцы нашай Радзімы — Маскве, у сталіцах саюзных рэспублік, а таксама ў гарадах-героях — Ленінградзе, Волгаградзе, Севастопалі і Адэсе дваццаццю артылерыйскімі залпамі.

Няхай жыве 47-я гадавіна Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту!

Няхай жыве вялікае непарушнае адзінства народа і арміі!

Слава створанай Леніным Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Міністр абароны СССР Маршал Савецкага Саюза
Р. МАЛІНОЎСКІ.

Да слаўнай гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адкрываецца мастацкая выстаўка «На варце міру». У ёй прымаюць удзел беларускія жывапісцы, скульптары, графікі. Змяшчаем адну з работ С. Адашкевіча — партрэт Рымы Шаршнёвай (гліс танірованы).

ІДЗЕ УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД НАРОДНЫХ УНІВЕРСІТЭТАЎ

ПОШУКІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Відаць, не трэба тлумачыць, якое важнае значэнне маюць для народных універсітэтаў пытанні вучэбнай работы. Яны вызначаюць увесь кірунак дзейнасці універсітэта, яго, калі можна так сказаць, тактыку і стратэгію.

Памятаю, на першым пасяджэнні савета універсітэта ў нас разгарэліся спрэчкі аб тым, які характар павінны насіць лекцыі, якімі праграмамі кіравацца ў сваёй дзейнасці. Вопыт педагагічнай работы ў школе, вопыт навучання ў сценах вну, які мелі члены савета, тут яўна не падыходзіў. Мы ж не збіраемся капіраваць агульнаадукацыйную школу, «вялікія» універсітэты. Народныя універсітэты — навучальныя ўстановы новага тыпу.

Спрэчкі на пасяджэннях савета ідуць і сёння. Мы працягваем пошукі найбольш дасканалых форм арганізацыі вучэбнага працэсу, і без жывога абмену думкамі тут не абысціся.

Я не ўпэўнена, што вопыт, выпрацаваны намі, будзе карысны для некага яшчэ — універсітэты ўсе розныя. Але абмен вопытам паміж імі — справа неабходная і паможа лепш удасканаліць вучэбны працэс.

Пасля доўгіх спрэчак мы прыйшлі да вываду, што найбольш мэтазгодна праводзіць не аглядавыя лекцыі тыпу «аб усім патрошку», а лекцыі, прысвечаныя аднаму, «вузкаму пытанню». Сапраўды, ці многа карысці ў тым, што народны універсітэт, падобна да адрыўнога календара, дае сваім слухачам раскіданыя вескі «пра ўсё»? Ці не лепш расказаць пра асобныя, найбольш важныя з'явы ў мастацтве, але рабіць гэта падрабязна і папулярна. Адзін з асноўных нашых недахопаў тое, што мы іншы раз намагаемся «ахапіць усё», выпусціць слухача-ўсязнайку.

Слухачы нашага універсітэта вывучаюць музычнае і выяўленчае мастацтва, тэатр, кіно. Гэта шырокі дыяпазон дысцыплін, але ніводнай з іх не выключыш з праграмы, бо ўсе яны цесна звязаны адна з другой. Гаворка ішла толькі пра тое, у якім парадку «праходзіць» прадметы, як чаргаваць лекцыі.

Пагадзіліся на тым, што метадычна немэтазгодна дапускаць вялікі разрыў у часе паміж лекцыямі па адной дысцыпліне. А заняткі ж у нас бываюць два разы на месяц, значыць нельга будзе адначасова вывучаць усе галіны мастацтва. Мы прыйшлі да вываду, што найбольш удалым будзе чаргаваць заняткі адразу па дзвюх дысцыплінах. Гэта адпавядае і нашым магчымасцям арганізацыі лекцый і інтарэсам слухачоў. Практыка пацвердзіла мэтазгоднасць такой праграмы.

Вядома, увесь вучэбны працэс, нельга звесці толькі да лекцый. Мы арганізуем канцэрты для слухачоў, прагляды і абмеркаванні спектакляў і кінафільмаў, дыспуты, гутаркі з пісьменнікамі, кампазітарамі, мастакамі, сустрэчы з артыстамі, рэжысёрамі.

Шмат увагі аддае савет «чыста» арганізацыйным пытанням. Многа часу адабрала, напрыклад, праблема рэгулярнага наведвання заняткаў. Цяпер такой праблемы ў нас няма.

Лекцыі ў нашым універсітэце чытае шырокае кола спецыялістаў. Але нямала намаганняў даводзіцца іншы раз прыкласці, каб «адстаяць» свайго лектара, не дапусціць пераносу заняткаў, дабіцца цікавай сустрэчы. Мала яшчэ нам дапамагаюць установы культуры, іншы раз яны ад нашых просьбаў проста адмахваюцца.

Напярэдадні і ў дні Дэкады рускага мастацтва ў Беларусі, нам, напрыклад, доўга давялося весці перагаворы, каб дамагчыся сустрэчы артыстаў са слухачамі. Бо калі складаўся план Дэкады, пра народныя універсітэты чамусьці забыліся.

Нашым універсітэтам сталі цікавіцца толькі ў таварыстве «Веды». Але дапамогі аднаго таварыства яўна мала. У нас жа ёсць шэфы. Ніхто з іх, аднак, даўно не быў ва універсітэце, не цікавіўся, як ідуць у нас справы. Без сур'ёзнай дапамогі універсітэту не абысціся.

М. МІРАНКОВА,
загадчык навучальнай часткі універсітэта эстэтычнага выхавання.
г. Магілёў.

ГЭТА НАШЫ СЯБРЫ

Аляксандр МІРОНАЎ

Здаўна мацнее, год ад году расце дружба беларускіх пісьменнікаў з воінамі гераічнай Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Гэта натуральна: не толькі старэйшае, але і сярэдняе пакаленне літаратараў нашай рэспублікі прайшло праз усе выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны, — хто ў радах арміі і флоту, хто ў партызанскіх атрадах на часова акупіраванай гітлераўскімі захопнікамі тэрыторыі. І хоць з тае пары мінула дваццаць гадоў, кожны з нас усё лічыць сябе ў баявым страі і імкнецца словам сваім, справай сваёй, усім сваім жыццём служыць умацаванню магутнасці Радзімы сацыялізма.

Вось чаму і едуць нашы пісьменнікі з такой ахвотай да сваіх сяброў не толькі ў бліжэйшыя, але і ў самыя далёкія воінскія гарнізоны. Едуць, як Янка Брыль, Максім Лужанін, Мікола Хведаровіч да лётчыкаў і маракоў Балтыкі, як Уладзімір Корбан да пільных вартавых Запаляр'я, як Лідзія Арабей да далёкаўсходнікаў. Міхась Калачынскі пабываў у сібіракоў, а Сяргей Грахоўскі і Павел Кавалёў — у пагранічнікаў.

Едуць, бо не могуць не ехаць. Таму што салдаты, сяржанты і афіцэры любяць і высока цэняць жывое пісьменніцкае слова. А што можа быць больш каштоўным і дарагім, чым такая непасрэдная, душа ў душу, сувязь пісьменнікаў і паэтаў са сваёй шматтысячнай і добразычлівай аўдыторыяй чытачоў!

Мне асабіста бліжэйшая, даражэйшая за ўсё дружба з нашымі пільнымі вартавымі заходніх пагранічных рубяжоў.

Цяжка зараз сказаць, з чаго і як пачыналася яна, таму што дружбе гэтай ужо не першы год. З іншым чалавекам жывеш побач, доўгія гады, сустракаешся з ім амаль кожны дзень, ведаеш як быццам лепш не трэба, а раз'едзешся ў розныя гарады, нават на розныя вуліцы ў тым жа горадзе, і — ні ўспамінаў аб ім, ні добрага слова... І, наадварот, у кожнага з нас бывае інакш. Выпадкова, зусім нечакана звядзе цябе жыццё з чалавекам. Прабудзеш з ім дзень, два, рэдка тыдзень. Быццам і размоў асаблівых у вас не было. І блізка пазнаць адзін аднаго не паспелі. І нават наўрад ці сустрэнешся яшчэ калі-небудзь. Але памятаеш гэтага чалавека. Доўгія гады памятаеш, заўсёды.

Так у мяне было ў мінулым годзе, улетку, на поўдні, на некалькіх пагранічных заставах, дзе афіцэры і салдаты расказвалі мне аб прыездзе да іх для абмену вопытам брэсцкага старшыны — пагранічніка Варлаама Міхайлавіча Кублашвілі. Я шмат чуў пра яго — пра тое, як за доўгую пагранічную службу старшына Кублашвілі затрымаў амаль трыццаць парушальнікаў дзяржаўнай граніцы Савецкага Саюза, як бяцца яго самыя зацятыя кантрабандысты, як умела, настойліва і цярпліва выхоўвае Кублашвілі маладую пагранічную змену. Гэта цудоўна, калі пра жывога чалавека, нашага сучасніка складаюць легенды. А такія легенды пра старшыну Кублашвілі ходзяць па ўсіх заставах, дзе нясуць баявую службу сотні яго выхаванцаў.

Ці можна заставацца раўнадушным да такога чалавека, не імкнуцца і пазнаёміцца і пасябраваць з ім, як пазнаёміўся і пасябраваў старэйшы беларускі пісьменнік Янка Маўр з Варлаамам Міхайлавічам! Узрост амаль у палавіну стагоддзя падзяляе іх: Маўру — за восемдзесят, Кублашвілі — пад трыццаць. Але нягледзячы на розніцу ў гадах, у гэтых людзей знайшліся і агульныя тэмы для бясконцых размоў, і агульныя інтарэсы. А ў выніку гэтай сувязі ў Янкі Маўра нарадзіўся цудоўны нарыс аб чалавеку, якога ведае і глыбока паважае ўся наша краіна.

Пісьменнікі ў пагранічнікаў — гэта ўжо адна са старэйшых і лепшых традыцый усёй савецкай літаратуры, вытокі якой ідуць да Сямёна Дзікоўскага, Барыса Гарбатава, Льва Кантаровіча і многіх-многіх іншых. Пагранічнікі ўмеюць цаніць сапраўдную, шчырую, сардэчную дружбу, умеюць берагчы і мацаваць яе. І зусім не выпадкова, што цэлы рад савецкіх пісьменнікаў, якія трывала звязалі сваё жыццё і творчасць сваю з пагранічнымі войскамі, за гэтую вернасць ім, за плённую сістэматычную ваенна-шэфскую работу ўжо ў пасляваенныя гады ўзнагароджаны баявымі медалямі «За выдатнасць у ахове дзяржаўнай граніцы СССР».

Мінчанін Мікалай Аляксееў пажылы чалавек, армейскі генерал-маёр у адстаўцы адкладвае, адкідае ўсе клопаты і працу і таксама гатовы імчаць да баявых сяброў. Рыжанін паэт Барыс Кунявіч, кіяўляне Мікола Шарамет, Платон Варанько, Якаў Стэцюк са Львова і многія іншыя не менш захопленыя суровымі салдацкімі буднямі і «ваеннай» тэмай у сваёй творчасці.

У апошнія гады нарадзілася яшчэ адна выдатная традыцыя: штогадовыя тыдні братніх савецкіх літаратур на заходніх рубяжах Савецкага Саюза. У апошнім з іх удзельнічалі пісьменнікі і паэты Літвы і Калінінграда, Мінска і Гродна, Кіева і Львова. На ўсёй адлегласці граніцы не засталося ніводнай заставы, ніводнага падраздзялення, дзе ні пабывалі б і ні зрабілі справаздачу перад воінамі аб сваёй творчай рабоце ўдзельнікі тыдня — прадстаўнікі чатырох братніх літаратур.

А як цэняць, як любяць і берагуць пагранічнікі жывое і важкае слова сяброў-літаратараў! На славутай заставе імя Віктара Усава служыць старшына Цімафей Іванавіч Александрэнка, на рахунку ў якога многа затрыманых парушальнікаў дзяржаўнай граніцы. Ц. Александрэнка — адзін з вопытнейшых выхавацеляў маладых салдат. Яго стараннямі ў ленінскім пакоі заставы створаны цэлы музей баявой славы, куды штогод наведваюцца сотні экскурсантаў з бліжэйшых і дальніх гарадоў і вёсак. Але, бадай, не менш, чым баявымі рэліквіямі пагранічнікаў-усаўцаў, якія першымі прынялі на сябе здрадніцкі ўдар гітлераўцаў у ноч на 22 чэрвеня 1941 года, Цімафей Іванавіч ганарыцца тым, што апублікавана ў газетах, у часопісах, у зборніках аб іх гераічнай заставе. Паліца з кнігамі забіта выданнямі з аўтографамі сяброў-пісьменнікаў, у зашклёных рамках выстаўлены выразкі з газет і часопісаў. Хіба гэта не ўдзячны матэрыял для выхавання маладых байцоў-першагодкаў!

Беларускі паэт Анатоль Астрэйка славіцца як майстар песеннага верша. Вельмі многія песні на яго тэксты распяваюць па ўсёй краіне, а без славутага «Нёмана» не абыходзіцца ніводзін эстрадны ансамбль. Ці мог ён, таксама ўдзельнічаючы ў літаратурным тыдні на граніцы, не напісаць, не выліць сваё захапленне ў новым вершы, у тэксце песні аб пільных вартавых граніцы? І сёння гэтую песню ўжо спяваюць не толькі на радзіме паэта. Я чуў яе на Украіне, у Калінінградзе, у Крыме. Таму што для добрай, патрэбнай народу песні няма і не можа існаваць ні адлегласцей, ні межаў.

Як нарадзілася гэтая песня? Вельмі проста. На адной з застаў Анатоль Астрэйка сустрэў афіцэра-пагранічніка Насевіча, разам з якім у гады Вялікай Айчыннай вайны дзяліў цяжар і нягоды барацьбы з гітлераўцамі. Дваццаць гадоў не бачыліся, і раптам — ці ты гэта, браток-партызан?! Гаварылі ўсю ноч, успаміналі былое, а пад раніцу, калі першыя сонечныя праменні пазалацілі лісце асенніх бяроз, паэт адчуў, зразумеў, што не можа не напісаць.

І напісаў. І песня набыла крылы, жыве.

Ды ці толькі песня? Прыгадваецца яшчэ адна сустрэча на заставе імя Андрэя Кіжаватава, з яго пляменнікам, яфрэйтарам Мікалаем Кіжаватавым, узнагароджаным медалем «За выдатнасць у ахове дзяржаўнай граніцы СССР». Зараз няма Мікалая на заставе: адслужыў тэрмін, дэмабілізаваўся і паехаў у роднае сяло Селікса, што на Пензеншчыне. Дарэчы, маленькая, але характэрная для гэтага хлапца дэталь: перад прызывам у армію ён пасадзіў у сваім сяле сад, даручыўшы даглядаць яго сябрам-аднасяльчанінам. Сад, вядома ж, хлопцы зберагліі, ён цяпер ужо разросся, пладаносіць, і даглядае яго зноў Мікалай Кіжаватаў. Дом жа свой ён ператварыў у музей памяці праслаўленага сваяка — героя Андрэя Кіжаватава.

Людзі едуць улетку на поўдзень, каб адпачыць, пагрэцца пад паўднёвым сонцам і накупацца ў моры на цэлы год. Пісьменнікі едуць да сяброў-воінаў, едуць працаваць.

Але чаму толькі ўлетку? Мне назаўсёды запомніліся марозныя дні побач з кантрольна-следавай паласой на берагах стылага Буга. І дажджлівыя, слотныя асенніх ночы ў пагранічных нарадах на ўзбярэжжы пасівелай ад штармавой лютасці Балтыкі. І першая зялёная дымка вясны на дрэвах пагранічных застаў маёй роднай Беларусі...

Але больш за ўсё помняцца людзі, цудоўныя, сціплыя і душэўна гасцінныя сябры-пагранічнікі. Вялікі майстар свежай юшкі і наймацнейшага чаю Цімафей Іванавіч Александрэнка. Сухаваты і стрыманы на выгляд начальнік заставы. Кнігалюб, небывалай адвагі хлопец, начальнік пражэктарнага паста малодшы сяржант Уладзімір Кісляко. Садоўнік-пагранічнік, пляменнік героя Мікалай Кіжаватаў...

Іх многа, іх незлічоная колькасць. І як добра, што ў нас, у пісьменнікаў, так многа цудоўных, самых верных і шчырых сяброў сярод савецкіх воінаў.

У ВОІНАЎ БВА

НА ВАРЦЕ МІРУ І ПРАЦЫ

Так называецца выстаўка літаратуры, арганізаваная бібліятэкай акруговага Дома афіцэраў у гонар 47-й гадавіны Савецкіх Узброеных Сіл.

На шматлікіх стэндах і вітрынах экспануюцца творы К. Маркса і Ул. І. Леніна. Увагу наведвальнікаў звяртаюць на сябе ленінскі зборнік «Аб замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайне ў СССР», які ўключае рад важнейшых работ Уладзіміра Ільіча, што адносяцца да перыяду 1918—1920 гг.; зборнік «Аб Узброеных Сілах Савецкага Саюза», які адкрываецца Дэкрэтам Саўнаркома ад 15 студзеня 1918 г. «Аб рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі»; ваенна-мемуарная і мастацкая літаратура аб мужнасці і гераізме савецкіх людзей на франтах грамадзянскай і Айчыннай вайны.

ВЫКОНВАЮЦЬ ТВОРЫ БЕЛАРУСКІХ АЎТАРАЎ

У рэпертуары калектыву мастацкай самадзейнасці Н-скай часці значнае месца займаюць творы беларускіх аўтараў. І гэта зусім зразумела. У адным толькі салдацкім хоры больш палавіны воінаў, прызваных з розных раёнаў Беларусі. Нямала беларусаў у танцавальным калектыве і сярод чытальнікаў.

Да акруговага агляду салдаты і сяржанты рыхтуюць цікавы і змястоўны канцэрт.

Салдацкі хор пад кіраўніцтвам радавога А. Кажушковіча выканае «Лясную песню», «Песню аб Мінску» Ул. Алоўнікава, «На граніцы» Ю. Семяныкі, творы А. Астроўскага, А. Пахмутавай і іншых кампазітараў.

Былы электраманцёр Барысаўскай фабрыкі пяніна, цяпер выдатнік вучобы, камсамолец радавы В. Ермачонак развучвае вершы Я. Купалы. Дачка ваеннаслужачага Ніна Цітова прачытае верш А. Куляшова «Камуністы».

ШЭФСКІ СПЕКТАКЛЬ

У гасцях у курсантаў Мінскага вышэйшага інжынернага радыётэхнічнага вучылішча пабываў калектыў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

Артысты расказалі будучым афіцэрам аб гісторыі і творчым шляху тэатра, пазнаёмілі іх з найбольш цікавымі работамі.

МАГІСТРАЛІ КУЛЬТУРЫ

Сем гадоў назад пры Гомельскім Палацы культура імя Ул. І. Леніна быў створаны першы на Беларускай чыгунцы універсітэт мастацкага выхавання. З таго часу гэтую грамадскую навучальную ўстанову скончылі каля паўтары тысячы работнікаў чыгуначнага вузла і членаў іх сем'яў. Сёння на трох факультэтах універсітэта — музычным, тэатральным і выяўленчага мастацтва — займаюцца каля 700 чалавек.

Універсітэт мастацкага выхавання — не адзіная грамадская навучальная ўстанова пры Гомельскім Палацы культуры. Восемсот старшакласнікаў вучацца тут у школе мастацкага выхавання. Школа рэгулярна наладжвае абмеркаванні твораў мастацтва, калектыўныя наведванні музеяў, выставак, спектакляў.

Усяго на Беларускай чыгунцы працуе трыццаць грамадскіх навучальных устаноў. Колькасць слухачоў у іх перавысіла шэсць тысяч чалавек.

У народным універсітэце чыгуначнага вузла Брэст займаюцца 59 чалавек, 42 з іх маюць вышэйшую адукацыю, 12 — сярэднюю.

Добра арганізаваны заняткі ў народным універсітэце пры Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту ў Гомелі. Лекцыі на грамадскіх асновах тут чытаюць прафесары і выкладчыкі інстытута. Універсітэт зрабіў ужо два выпускі.

Ваўкавыскі чыгуначны вузел маленькі ў параўнанні з Гомелем і Брэстам. Але і тут пры клубе чыгуначнікаў ёсць два універсітэты. На заняткі рэгулярна абмяркоўваюцца дакументальныя і хранікальныя фільмы, новыя кнігі. Паспяхова прайшло ва універсітэтах абмеркаванне рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні» і выстаўкі дзіцячай творчасці.

Добра працуюць актывісты — чыгуначнікі Гомеля, Брэста, Ваўкавыска. Браць бы з іх прыклад грамадскасці Мінскага чыгуначнага вузла! Дзіўна, але тут няма сёння ніводнай грамадскай навучальнай установы. Летась, праўда, народны універсітэт выпусціў 120 слухачоў, але на гэтым яго работа спынілася. А на вузле працуе шматтысячны калектыў, тут ёсць свой Дом тэхнікі, клуб, вялікі атрад спецыялістаў.

У чыгуначнікаў шырокія магчымасці. Іх трэба выкарыстаць, каб магістралі чыгункі сталі сапраўднымі магістралямі культуры.

ВУЧОБА І ПРАКТЫКА ПОБАЧ

Ва Усесаюзны грамадскі агляд народных універсітэтаў уключыліся шэсць універсітэтаў Кіраўскага раёна. Аглядавая камісія разам з раённым саветам па кіраўніцтву народнымі універсітэтамі склала план абагульнення і распаўсюджвання вопыту лепшых грамадскіх навучальных устаноў.

Адзін з лепшых універсітэтаў раёна — універсітэт пры калгасе імя Дзяржынскага. Яго слухачы — брыгадзіры, загадчыкі ферм, калгаснікі — атрымліваюць веды па агульнаму земляробству, жывёлагадоўлі, механізацыі, аграхіміі. Лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі праводзяцца ў абсталяваных кабінетах суседняга Жыліцкага сельгастэхнікума. Чытаюць ва універсітэце выкладчыкі тэхнікума Н. Русецкая, А. Пазнякоў, К. Мурашка і інш.

Слухачы універсітэта — перадавікі вырошчвання цукровых буракоў, збожжавых культур, бульбы, гародніны і ільну ў калгасе. Вучоба і практыка ідуць у іх побач.

У. КАРПАЎ.

ТЭМАТЫЧНЫ ПАКАЗ ФІЛЬМАЎ

У гарадах і вёсках рэспублікі пачаўся паказ фільмаў, якія адлюстроўваюць слаўны шлях Савецкіх Узброеных Сіл.

З вялікай цікавасцю прагледзяць гледачы мастацкія кінанарціны «Балада пра салдата», «Лёс чалавека», «Два байцы», «Чалавек не здаецца», «Трэцяя ракета», «Неўміручы гарнізон», «Ля твайго парога», «Аповесць палымяных гадоў», «Прага», «Зорка» і іншыя.

Новая мастацкая кінааповесць «Пядзя зямлі» вытворчасці кінастудыі «Масфільм» уславярашае гісторыю барацьбы за маленькі плацдарм на правым беразе Днястра, які на працягу некалькіх тыдняў абараняла невялікая група савецкіх салдат.

Пра людзей санітарнага цягніка, якія на цяжкіх дарогах вайны мужна і сціпла выконвалі свой абавязак, апавядае новая мастацкая кінанарціна «Поезд міласэрнасці», створаная рэжысёрам І. Хамраевым на кінастудыі «Ленфільм» па матывах аповесці В. Пановай «Спадарожнікі». У галоўных ролях здымаліся акцёры В. Зубкоў, М. Екацярынскі, Э. Папова, Ж. Прахарэнка і інш.

На экранах рэспублікі дэманструюцца таксама хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі «Вялікая перамога савецкага народа», «Героі Брэста», «Неўміручае юнацтва», «Кацюша», «Гісторыя аднаго подзвігу», «Легендарны Севастопаль», «Невядомаму салдату», «Яны ўзнялі сцяг перамогі», «Наш флот на вахце баявой» і інш.

СТАРОНКІ НАРОДНАГА ПОДЗВІГУ

Ілья КАПАЛІН,
кінарэжысёр, народны артыст РСФСР

ПАЧАТКОВЫЯ старонкі гісторыі Савецкай дзяржавы, абвеяныя славай велізарнага подзвігу народа, які адстаяў у неверагодна цяжкіх умовах Рэспубліку Саветаў, даўно хвалявалі маё ўяўленне. Хацелася прачытаць іх моваю дакументальнага кінематографа. І вось, у выніку нашай сумеснай з пісьменнікам Аляксандрам Бекам работы, паявіўся фільм «Старонкі бессмяротнасці». Пра што ён?

Гэта карціна аб першых гадах станаўлення Савецкай улады, аб грамадзянскай вайне, аб барацьбе працоўных нашай краіны з чужаземнымі інтэрвентамі і унутранай контрэвалюцыяй. Гэта фільм пра гераізм народа, пра яго пакуты і мужнасць, пра яго рашучасць адстаяць завяёвы Кастрычніка. Гэта фільм пра геніяльнае ленінскае кіраўніцтва ўсім ходам барацьбы, пра мужнасць ленінскай партыі і пра самаахвярную адданасць справе рэвалюцыі яе сыноў — слаўных палкаводцаў, камандзіраў і камісараў Чырвонай Арміі. Але гэта фільм і пра міжнародную салідарнасць працоўных, якія ўзнялі голас у абарону Савецкай Расіі і патрабавалі адклікання з яе межаў салдат Антанты.

У нашым фільме, думаецца, шырока паказана роля інтэрнацыянальных брыгад, батальёнаў і палкоў, якія ваявалі ў радах Чырвонай Арміі з белагвардзейцамі і інтэрвентамі. Чэхі і славакі, кітайцы, венгры, палякі, румыны, сербы, балгары — сыны многіх народаў змагаліся плячо ў плячо з Чырвонай Арміяй, выконвалі свой абавязак інтэрнацыянальнай салідарнасці з працоўнымі нашай краіны. І ўвайшлі ў нашу гісторыю імёны паляка Караля Свярчэўскага, серба Алека Дундзіча, венгра Матэ Залка, чэха Яраслава Гашака, французкі Жаны Лябурб і многіх іншых самаадданых барацьбітоў за ідэі Рускай Рэвалюцыі.

І хоць наш фільм пра грамадзянскую вайну, ён не ставіць сваёй задачай храналагічны паказ падзей, падрабязнае апісанне ваенных аперацый або подзвігаў асобных герояў. Герой нашага фільма — народ. Мы імкнуліся данесці да гледача атмасферу тых далёкіх дзён, атмасферу велізарнага рэвалюцыйнага ўздыму і тых вялікіх цяжкасцей, якія пераадолеў наш народ, абараняючы завяяванае ў Кастрычніку.

Сёння жыве ўжо трэцяе пакаленне людзей, і для многіх маладых грамадзянская вайна, голад, разруха, інтэрвенцыя, белагвардзейшчына, контрэвалюцыйныя мецяжы і белы тэрор сталі далёкай гісторыяй, амаль легендай. Вось чаму мы адрасуем наш фільм у першую чаргу да моладзі, каб нагадаць пра гэтыя дні, пра подзвіг бацькоў, дзядоў і прадзедаў. Адрасуем з надзеяй, што гэтыя подзвігі натхняць нашу моладзь на подзвігі ў мірным баі — у будаўніцтве камунізма, будуць памагаць у выхаванні патрыятычных пачуццяў любві да сваёй вялікай Радзімы.

Перад гледачом праходзіць вялікая галерэя слаўных палкаводцаў і камісараў Чырвонай Арміі, чые імёны былі выкраслены з гісторыі ў перыяд культу асобы. Побач з выдатнымі палкаводцамі Чырвонай Арміі М. Фрунзе, В. Чапаевым, С. Будзённым, К. Варашылавым стаяць імёны В. Блюхера, М. Тухачэўскага, І. Якіра, А. Ягорава, Ф. Раскольнікава, Г. Гая і многіх іншых, чые баявыя подзвігі павінны стаць здабыткам народа. Пра іх расказана ў фільме. Наш фільм пабудаваны, у асноўным, на кіна-і фотаматэрыялах, сабраных у архівах і музеях Савецкага Саюза і многіх зарубежных краін. Увогуле групай прагледжана каля 800 тысяч метраў кінаплёнкі для таго, каб зманціраваць фільм у 2100 метраў. Адбор архіўных матэрыялаў — адна з найбольш працаёмкіх работ, праведзеных групай. Іншы раз мы праглядалі дзесяткі тысяч метраў і адбіралі толькі некалькі метраў патрэбнага і цікавага матэрыялу. Так былі знойдзены і ўпершыню апублікаваны ў фільме здымкі восьмага з'езда партыі (адна з першых здымак у Крамлі), знойдзены новыя кадры, якія паказваюць В. Чапаева, Ф. Раскольнікава, Джона Рыда і іншыя.

Вялікую дапамогу і садзеянне ў адборы матэрыялаў нам аказалі нашы сябры — кінематаграфісты ГДР, Чэхаславакіі, Венгрыі, Польшчы, а таксама работнікі кінаархіваў Францыі, Англіі. Мы глыбока ўдзячны ім за гэта.

Аўтары карціны заўсёды ўспаміналі добрым словам тых, хто пакінуў нам неацэнную спадчыну — аператараў, якія здымалі на франтах грамадзянскай вайны. Гэта ветэраны савецкага кіно Г. Гібер, П. Ярмолаў, А. Лявіцкі, А. Лемберг, П. Навіцкі, Е. Славінскі, Э. Цісе. Імёны іх здымкі з тых далёкіх дзён і лягі ў аснову фільма.

На працягу года шэсць здымачных груп працавалі ў розных раёнах краіны, на месцах былых франтоў грамадзянскай вайны, здымаючы мемарыяльныя помнікі, жывых удзельнікаў падзей, месцы баёў, пакінуты сляды зверстваў белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Гэтыя здымкі вялі аператары Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў: І. Грачоў, Г. Зямцоў, А. Зянякін, Е. Легат, А. Савін, В. Цытрон. У гэтай рабоце ім памагалі студэнты Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі.

Народы Савецкай краіны берагуць памяць аб героях грамадзянскай вайны. У гэтым мы пераканаліся, здымаючы нашу карціну і, у прыватнасці, помнікі героям для пралога і эпілога фільма.

Памяць аб тых днях захоўваецца не толькі ў дакументах, але і ў песнях, якія спявае наш народ. У музычным афармленні фільма, апроч музыкі, спецыяльна напісанай кампазітарам Л. Кніперам, намі шырока выкарыстоўваюцца мелодыі песень грамадзянскай вайны. Мантаж фільма дзякуючы адрывачнасці матэрыялу з'явіўся вельмі складаным працэсам. У яго выражэнні вялікая роля належыць другому рэжысёру С. Пумпянскай. І, вядома, я не магу не ўспомніць пра вялікую работу рэдактара фільма А. Каўтуновай, рэдактара кінаэтапісу В. Казаковай, работнікаў Цэнтральнага Дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў і Дзяржфільмафонду, а таксама тых, хто кансультаваў нас у рабоце над фільмамі, — дактароў гістарычных навук Г. Голікава, С. Найда і генерал-лейтэнанта А. Тадорскага, генерал-маёра М. Яроміна.

І вось, фільм, над якім мы працавалі каля паўтара гадоў, закончаны. Мы прысвяцілі яго вялікай даце — 50-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі.

АДН.

ДАРОГІ ЎСВЕТ ПРЫГОЖАГА

ЭМОЦЫЯ ЖЫВОГА СЛОВА

У газеце «Літаратура і мастацтва» за 26 студзеня 1965 года надрукаваны артыкул Ул. Юрэвіча «І ў слове — харастро».

Аўтар, праўда, больш гаворыць пра мастацкае чытанне, але закранае і вельмі актуальнае пытанне культуры мовы педагогаў. Я цалкам згодна з Ул. Юрэвічам, што многія настаўнікі, выкладчыкі ву дрэнна валодаюць словам. А любы выкладчык абавязаны сачыць за сваёй мовай, думаць не толькі аб тым, што гаварыць, але і аб тым, як гаварыць. Такім чынам трэба прадумваць старанна не толькі змест урока або лекцыі, іх фактычны матэрыял, але і форму.

Мы часта, на жаль, застаёмся задаволеныя тым, што вучні праяўляюць веды па той ці іншай дысцыпліне, і даруем ім недахопы мовы, яе неахайнасць, а часта і няправільнасць. Вось чаму нават студэнты педагагічных ву, будучыя настаўнікі часта бездапаможныя ў вытлумачэнні слова, нават калі і па-свойму яго разумеюць. На дапамогу ім прыходзіць і жэст, і міміка, толькі не слова, якім абавязаны добра валодаць выкладчык, незалежна ад таго, які прадмет ён будзе весці.

Мы яшчэ мала думаем пра кожнага асобнага студэнта як пра будучага выкладчыка, носьбіта ведаў і культуры. Лішне даказваць, што ад умення правільна, ярка, вобразна, эмацыянальна выказваць думку залежыць і поспех выкладання.

Хочацца сказаць і пра чысціню мовы. Беларуская і руская мовы блізкія, сваяцкія. Але трэба заўсёды памятаць, на якой мове выкладаеш думку, і сачыць за чысцінёй кожнай з іх.

Памятаю, у Мінскім педвучылішчы да вайны беларускую мову выкладала Аляксандра Уладзіміраўна Пігулеўская. Кожнае яе выступленне было ўзорам правільнасці і прыгажосці роднай мовы. Я ўпэўнена, што яе былыя студэнты, цяперашнія настаўнікі, навучыліся ў яе любіць сваю мову, валодаць ёю і вучаць любіць яе сваіх вучняў.

Я цалкам згодна з Ул. Юрэвічам: неабходна дзіця вучыць правільнай мове з першых гадоў яго жыцця. Для гэтага, зразумела, людзі, якія акружаюць і выхоўваюць яго, абавязаны гаварыць правільна.

Яшчэ, мне здаецца, газета «Літаратура і мастацтва» павінна на сваіх старонках часцей асвятляць пытанні культуры мовы. Магчыма, трэба было б арганізаваць спецыяльны аддзел, накшталт як у «Литературной газете»,—«Служба мовы».

Х. КРОЛЬ,
педагог.

г. Мінск.

КАБ НЕ БЫЛО «ДАГРУЗАК»

Думку аб тым, што спевы і маляванне ў школе яшчэ лічаць другарадныя прадметамі, выказвалі на старонках «Літаратуры і мастацтва» многія. З імі нельга не пагадзіцца. Сапраўды, спевы і маляванне часта выкладаюць настаўнікі, якія не маюць ні адпаведнай адукацыі, ні патрэбных здольнасцей. Гэтыя дысцыпліны даручаюць ім весці ў парадку так званай «дагрузкі».

Многія кіраўнікі школ наогул не звяртаюць увагі на паляпшэнне эстэтычнага выхавання вучняў. Так, загадчыку Стаўбцоўскага райана тав. Багдановічу абласны аддзел народнай асветы даў указанне забяспечыць за два—тры гады ўсе школы музычнымі інструментамі і на раённых, куставых курсах навучыць іграць на іх найбольш здольных настаўнікаў. Прайшоў час, а нічога ў гэтых адносінах у раёне не зроблена.

Вось яшчэ адзін прыклад нядбайных адносін да справы. Міністэрства асветы БССР даручыла дырэктару Слуцкай сярэдняй школы № 2 тав. Магіляўцу арганізаваць у сябе дзвінаццацімесячныя курсы і рыхтаваць на іх настаўнікаў спеваў для пачатковых класаў. Рэкамендавалася прымаць на іх юнакоў і дзяўчат з сярэдняй адукацыяй, якія маюць развіты музычны слых і голас. Аднак тав. Магілявец ужо некалькі гадоў прымае на гэтыя курсы людзей, не правяраючы папярэдне іх музычныя даныя, у выніку многія пасля вучобы не могуць весці ўрокі спеваў.

Такіх прыкладаў можна прывесці нямала. Аўтары многіх артыкулаў, прысвечаных гэтаму пытанню, выказалі на старонках «Літаратуры і мастацтва» шмат слушных думак, заўваг. Аднак не з усімі з іх можна пагадзіцца. Я хачу запярэчыць метадысту па эстэтычным выхаванні Брэсцкага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў М. Гелеру. Ён задае ў сваім артыкуле такое пытанне: «Чаму паспяховасць па спевах і маляванню не ўплывае на перавод вучня ў наступны клас? Я ўжо не кажу пра тое, што гэта ні ў якай меры не стымулюе вучняў».

Няўжо М. Гелер думае, што, калі вучань атрымае двойку па спевах і застанецца з-за яе на другі год у тым жа класе, гэта выкліча ў яго цікавасць да музыкі і будзе садзейнічаць развіццю музычнага слыху?

У вучня не развіты музычны слых, ён не можа спяваць правільна ніводнай песні, а настаўнік ставіць яму двойку. За што? Сам жа вучань не можа развіць у сябе слых — гэта павінны былі зрабіць яшчэ ў дашкольны перыяд у дзіцячым садзе, у сям'і. Але, калі бацькі па сваёй занятасці або недасведчанасці не зрабілі гэтага, ці вінавата ў гэтым дзіця? Ці можна потым ставіць яму за гэта двойку, пакідаць у класе на другі год? Ні ў якім выпадку!

Няправільна разважае і дырэктар Смалявіцкай сярэдняй школы № 1 (цяпер загадчык Смалявіцкага райана) М. Сакалоўскі. Эстэтычнае выхаванне — гэта не толькі добра пастаўленае выкладанне спеваў і малявання ды школьная Траццякоўка. Праўда, вывешаныя на калідоры рэпрадукцыі прываблiваюць увагу вучняў. Але і яны паступова надакучаюць дзецям, трацяць сваё хараство.

Возьмем чысціню і акуратнасць. Гэта не толькі зарука здароўя, але і элементы эстэтыкі. Аднак многія вучні, асабліва пятых — сёмых класаў, выглядаюць неахайна.

Афармленне школы таксама выхоўвае дзяцей. Але нярэдка гэты фактар выхавання ігнаруецца. Так, часта ў школе ўбачыш вялізныя, няўклюдныя стэнды, якія трымаюць на сабе... ліст ватманскай паперы. Гэта — узор неразумнага, нерацыянальнага выкарыстання матэрыялаў, а пра эстэтыку тут ўжо і гаварыць не прыходзіцца. Часта нават такі стэнд пашаны са сваёй «залатой» мішурой амаль нагадвае царкоўны амбон.

Хочацца выказаць некалькі заўваг і прапаноў, як палепшыць выкладанне спеваў у агульнаадукацыйных школах.

Факультэты пачатковых класаў завочнага навучання пры педінстытутах рыхтуюць настаўнікаў пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыі, але ігры на музычных інструментах іх не навучаюць (бо гэта не прадугледжана вучэбным планам). Такім чынам рыхтуюцца кадры з «запланаваным браком». І гэта не хвалюе Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі, кадры ж яно рыхтуе не для сябе, а для Міністэрства асветы!

А гэтым двум міністэрствам варта было б арганізаваць курс завочнага навучання ў педінстытутах пры літаратурна-музычных факультэтах. Або чаму б па прыкладу РСФСР і іншых рэспублік не стварыць у Беларусі музычна-педагагічныя факультэты, хоць бы пры некалькіх ву?

Трэба мець добрыя падручнікі па спевах. У падручніку ж для першага і другога класаў «Нашы песні», падрыхтаваным Навукова-даследчым інстытутам педагогікі Міністэрства асветы БССР, адсутнічаюць тэмы агульнамузычнага развіцця вучняў; у іх распрацавана толькі адно пытанне — навучанне спяванню па нотах.

Трошкі лепш складзены падручнікі для трэцяга і чацвёртага класаў, але і яны схематычныя і патрабуюць лепшай апрацоўкі.

Значную рэпертуарную дапамогу аказаў настаўнікам пачатковых класаў зборнік песень для васьмігадовай школы (укладальнік Н. Хаўхлянцаў). Шкада, што ў ім сабраны ўсе існуючыя сучасныя дзіцячыя песні без крытычнага падыходу, без адбору іх па мастацкай вартасці. Некаторыя з іх надрукаваны ў танальнасцях, не даступных па дыяпазону для дзяцей. Але і гэты зборнік выдадзены такім малым тыражом, што больш палавіны школ не магло набыць яго.

І, нарэшце, у штатах абласных інстытутаў удасканалення настаўнікаў прадугледжана пасада метадыста па эстэтычным выхаванні. Ад яго залежыць пастаноўка эстэтычнага выхавання ў школах вобласці. Але спецыялістаў такога шырокага профілю ніводная навучальная ўстанова не рыхтуе. Здавалася б, што Міністэрства асветы павінна было б арганізаваць вучобу, абмен вопытам работы метадыстаў. Але гэта не робіцца, кожны з іх пакінуты сам на сябе.

І. ПАПОЎ,
метадыст Мінскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў па эстэтычным выхаванні.

ДУМКІ, ПРАПАНОВЫ

РАДКІ З ПІСЬМАЎ

Ад таго, які будзе асведчаны сам настаўнік, як ён будзе ўмець разумець і цаніць прыгажосць, у значнай ступені залежыць і поспех у эстэтычным выхаванні вучняў.

Таму асабліва непакоіць абмежаванасць у вучэбных планах факультэтаў пачатковых класаў педагагічных інстытутаў. Тут вучаць музыцы, малюнку. Гэта добра. А вось філалагічная адукацыя студэнта абмежавана толькі 160 гадзінамі дзіцячай літаратуры. На гэтым і заканчваецца літаратурная адукацыя будучага настаўніка. Не скажаш, што выходзіць ён з інстытута з багатым багажом!

М. МІХАЙЛАЎ,
старшы выкладчык Магілёўскага педінстытута.

Навучыць падрастаючае пакаленне бачыць і адчуваць прыгожае ў нашым жыцці і ў стваральнай працы савецкага чалавека, навучыць дзяцей захапляцца і любіць родную прыроду, свой край — вось яна, удзячная задача ўсіх выхавацеляў.

С. ПАСЬ,
настаўнік Шчадрынскай сярэдняй школы Жлобінскага раёна.

Рэдка праводзяцца на ўроках малявання ў школах гутаркі аб мастаках. Малюнкі на вольную тэму — таксама рэдкасць. Затое школьнікі цалы год вымушаны маляваць розныя шары, кубы, вазы, табурэткі і г. д. Знікае дзіцячая фантазія, творчасць. Вучні выконваюць гэтыя заданні толькі з-за ацэнкі, без усялякай эстэтычнай асалоды.

В. ХАСМАН,
настаўнік школы № 90
г. Мінска.

Ні ў адным з падручнікаў няма звестак пра гісторыю развіцця беларускага тэатральнага мастацтва. А яны былі б вельмі дарэчы пры вывучэнні твораў і Дуніна-Марцінкевіча, і Янкі Купалы, і Кандрата Крапівы.

І. РАБКОЎ,
настаўнік Абчугскай сярэдняй школы Крупскага раёна.

Звычайна мы прывыклі думаць, што эстэтычнае выхаванне школьнікаў цалкам залежыць ад выкладчыкаў літаратуры, малявання, спеваў. А ўсёй гісторыяй чалавецтва даказана, што без працы не можа быць жыцця, а без жыцця не можа быць мастацтва. Значыць, эстэтычна выхоўвае людзей праца. Зрабіў вучань у школьнай майстэрні звычайную табурэтку, уклаў у яе, як кажуць, душу. І ён адчувае задавальненне, асалоду ад плёну сваіх рук. Пасадзіў дрэўца—зноў тое ж самае пачуццё. Выходзіць, невычарпальная крыніцай прыгажосці з'яўляецца само жыццё, родная прырода, а жывапіс, літаратура, музыка, танцы — толькі ручаіны, якія бяруць пачатак з гэтай чыстай крыніцы. Аб гэтым заўсёды павінны памятаць мы, настаўнікі, выхоўваючы дзяцей і працаю.

С. АНАНІЧ,
настаўнік Моцінскай сярэдняй школы Клічаўскага раёна.

Вучнёўскі савет створан пры бібліятэцы Мінскай сярэдняй школы № 41. Восем дзяўчынак і хлопчыкаў, членаў савета, дапамагаюць бібліятэкару Б. Парцеўскай падбіраць патрэбную літаратуру, сочаць за парадкам у бібліятэцы.

На здымку — Б. Парцеўская і члены савета Ул. Доля, Ю. Пракапенка і Г. Купрыненка праглядаюць фармуляры чытачоў.

Фота П. ЛАСТАЎКІ.

НА АГЛЯДАХ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Гарадскі агляд мастацкай самадзейнасці адбыўся ў Брэсце. Паспяхова выступіў на ім гарадскі сімфанічны аркестр, які вы бачыце на гэтым здымку.

Фота А. ВЕЛІКАСЕЛЬЦА.

ПЕСНІ НАРАДЗІЛІСЯ Ў ЛІДЗЕ

Адбыўся заключны канцэрт агляду мастацкай самадзейнасці горада Ліды. Драматычны калектыў Дома культуры паказаў новы спектакль па п'есе І. Козела «Над хвалямі Серабранні» (рэжысёр П. Данука, мастак Ул. Каравашкін).

«Песню аб партыі» М. Маслава добра праспяваў хор завода «Лідсельмаш».

У выкананні харавога калектыву гарадскога Дома культуры прагучалі новыя творы самадзейнага кампазітара А. Шыдлоўскага «Паглядзі, мой друж», «Вось дык гэта арлы», а таксама «Песня аб лідскіх падпольшчыках», яную напісаў загадчык гарадскога аддзела культуры В. Аламаха.

У заключным канцэрце агляду прыняло ўдзел звыш 350 самадзейных артыстаў.

М. КАВАЛЕЎ.

ТАНЦЫ МЕЛІ ПОСПЕХ

Танец «Мядзведжая акадэмія» паказаў на раённым аглядзе ансамбль песні і танца Смаргонскага Дома культуры. Гэты танец мае сваю гісторыю. Калісьці Смаргонь славілася «Мядзведжай акадэміяй». Сюды заможныя магнаты аддавалі ў навуку касалапых гаспадароў беларускіх пушчаў. У смаргонскіх «акадэмікаў» быў незвычайны метад вучобы сваіх ласных «студэнтаў». Адну заднюю лапу мядзведзя абувалі ў лапаць і гналі звера на гарачую каменную пліту. Атрымліваўся своеасаблівы танец.

Самадзейныя артысты паставілі таксама другі жартоўны танец — «Смаргонскія абранні». Новыя хараграфічныя творы вылучаны на абласны агляд.

А. АЛІН.

ІДУЦЬ РЭПЕТЫЦЫІ...

РЭПАРТАЖ З ТВОРЧАГА КАЛЕКТЫВУ

Мінулы год для Дзяржаўнага народнага хору БССР быў урадлівы. Яго артысты далі 169 канцэртаў. Нядаўна фотааматары нашага хору аформілі спецыяльны стэнд, які падрабязна расказвае пра леташнія гастрольныя паездкі калектыву. І, гледзячы на фотаздымкі, артысты ўспамінаюць вялікае турнэ па гарадах Цалиннага краю, Кіргізіі, Туркменіі, Таджыкістана, пра ўдзел у фестывалі «Ташкенцкая вясна», канцэрты ў Польскай Народнай Рэспубліцы і ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве. А колькі выступленняў адбылося ў роднай Беларусі!

Няма чаго казаць, работа была вельмі напружаная і цікавая. Уражанні ад паездак доўга яшчэ будуць жыць у нашай памяці. Але цяпер усе думкі артыстаў скіраваны ў будучыню.

Набліжаецца пяцідзесяцігоддзе Вялікага Кастрычніка, і народны хор, уключыўшыся ва Ўсесаюзны агляд прафесіянальных творчых калектываў, ужо рыхтуецца да слаўнай даты ў гісторыі нашай краіны.

Галоўныя патрабаванні да ўдзельнікаў агляду: падрыхтаваць і выканаць у гэты перыяд не менш дзвюх мастацкіх праграм, павысіць прафесіянальнае майстэрства, актывізаваць дзейнасць па культурным абслугоўванні насельніцтва сваёй рэспублікі, дамагчыся сістэматычнага выканання вытворча-фінансавага плана, дапамагаць мастацкай самадзейнасці.

Падрыхтоўка новай праграмы ў разгары.

Наш калектыў ператварыўся ў своеасаблівую творчую лабараторыю з цэнтрам у кабінеце мастацкага кіраўніка народнага артыста БССР Генадзя Іванавіча Цітовіча. Тут апрацоўваюцца харавыя творы, распісваюцца партыі па галасах, аркеструецца музыка да танцавальных пастановак.

Напружана працуюць і ў групах, дзе творчыя задумы непасрэдна ператвараюцца ў канцэртныя нумары.

... Невялікая распеўка харыстаў закончана. Раздадзены ноты беларускай народнай песні «Дзед і баба». Хормайстар Анатоль Бальцэвіч дае знак і жаночыя галасы ўступаюць: «Пасылала баба дзеда ў лес па калінку...» За імі — мужчынскія, але не скончылі яны яшчэ і першай фразы, як раптам — стоп.

— Нізка, тэнары. Вымаўляйце зычныя выразна! Пачнём спачатку...

І гэтае «спачатку» паўтараецца па некалькі разоў. Спевакам даводзіцца спыняцца літаральна на кожнай нотцы, на кожнай музычнай фразе.

Пасля перапынку пачынаецца работа над новай песняй. Зараз за «пультам кіравання» другі хормайстар Яўген Грамыка.

— Та, та, та, та, — мерна адлічвае ён паўзы.

І хор ужо як быццам праспяваў роўна, але пасля ветлівага «дзякуй» чуюцца словы:

— Альты, не таніце. Таварышы басы, я ж прасіў без націску, калі ласка, мякчэй.

І так а дня на дзень. Хормайстры дамагаюцца ад спевакоў стройнасці і знітаванасці гучання галасоў, выразнасці дыкцыі, чысціні інтанавання.

Але гэта толькі «чарнавая работа», а потым — заключны этап. І тут рашаючае слова — за мастацкім кіраўніком. Укладваючы душу ў любы твор, Генадзь Іванавіч дамагаецца шчырасці, цеплыні выканання ад артыстаў. І яны не толькі галасамі, але і знешнім выразам твару стараюцца раскрыць і перадаць змест твора.

З запалам працуюць і танцоры. Яшчэ на лесвіцы, што вядзе ў балетную залу, вас сустракае рознагалосы перастук. Танцоры б'юць драбушкі, скачуць, кружацца ў коле.

Інспектар Мікалай Лапша, паляпаўшы ў далоні, аб'яўляе:

— Сталі на «Беларускую сюіту».

— Пачынаем з выхаду дзяўчат, — тлумачыць рэпецітар Н. Малахава.

Пад вясёлую музыку «Мікіты» танцоўшчыцы рухаюцца лёгка і гулліва. Іх дзесяць чалавек, а рабіць рухі яны павінны як адна, і Надзежда Мікітаўна паспявае прасачыць за ўсімі — ад яе відушчага вока нічога не ўтоіцца...

Балетмайстра П. Акулёнка ў зале няма. Мераючы павольнымі крокамі шырокае фае, ён засяроджана абдумвае танцавальную частку новай вакальна-харэаграфічнай сюіты «У калгасным клубе». Яго перш за ўсё непакоіць, як надаць вясковаму танцу з «прытуляннямі» сцэнічны бляск, захаваўшы адначасова яго прастату і непасрэднасць.

Рэпетыцыя «Беларускай сюіты» скончана. Пётр Сяргеевіч Акулёнак спяшаецца наверх. Пачынаецца новая пастаноўка.

Ад спевакоў і танцораў не адстаюць і музыканты на чале з К. Паплаўскім. Ды інакш і нельга. Бо ім за кароткі тэрмін належыць вывучыць напамяць суправаджэнне песень, танцаў, ды яшчэ і самастойныя інструментальныя нумары. А гэта не так проста. І тут ужо няма калі глядзець на час.

Так дружнымі намаганнямі ўсяго калектыву народнага хору ствараецца новая праграма. Яе адкрые «Прывітальная песня» самадзейнага кампазітара М. Пятрэнкі.

Сучасныя, глыбокія па змесце і такія творы, як «Камуніст» І. Ронькіна (словы А. Харкевіча), «Салігорскія шахцёры» Я. Яравога (словы Н. Чураева), «Квітней, мой край» А. Граса (словы А. Дзеружынскага), «Радзіма» Ю. Талесніка (словы А. Пракоф'ева).

Прыемнай разнастайнасцю праграмы з'явяцца жартоўныя песні «Праводзіў мяне Цімох» М. Ларкова (словы А. Русака), якую рыхтуе Тамара Грабеннікава з жаночым хорам. «Прымакі» ў апрацоўцы К. Паплаўскага для мужчынскай групы хору, частушкі, напісаныя паэтам-песеннікам Адамам Русаком.

Парадаваў нас зноў кампазітар І. Кузняцоў. У сваёй інтэрпрэтацыі ён прынёс у калектыў рускую народную песню «За Кубанню, за рэкой». Яна падабаецца выканаўцам і салістцы-запявале Валянціне Прыдачынай. І нягледзячы на складанасць апрацоўкі, песню гэтую развучылі за два дні.

З танцавальных нумароў, пастаўленых галоўным балетмайстрам заслужаным дзеячом мастацтва БССР П. Акулёнкам, апроч адзначаных вышэй, гледачы ўбачаць «Рускі танец» і жаночы танец «Весялуху».

Для аматараў музыкі квартэт народных інструментаў з дуэтам цымбалаў рыхтуе «Беларускія карцінкі» К. Паплаўскага і «Танец» з «Беларускай сюіты» Я. Глебава.

Працуючы над новай праграмай, калектыў не забывае і аб удзельніках мастацкай самадзейнасці. Памагае ім словам і справаю. Так, Г. Цітовіч у студзені і лютым кансультаваў самадзейных артыстаў пасёлка Мядзель. У ансамблі калгаса «Слава працы» Слонімскага раёна балетмайстар П. Акулёнак паставіў «Беларускую кадрылю» і карагод «Рэчанька». З хорам вёскі Сваткі Мядзельскага раёна часта рэпеціруе саліст С. Модлін, а артыст В. Бабачкін шэфствуе над самадзейнасцю чыгуначнага клуба станцыі Крупкі.

Нядаўна з Вялікага Падлесся Ляхавіцкага раёна вярнуўся А. Бальцэвіч, на працягу пяці дзён ён займаўся там з калгаснымі спевакамі.

Народны хор памагае многім аматарам, тым больш цяпер, калі праходзіць рэспубліканскі агляд самадзейнага мастацтва, ад якога артысты хору чакаюць для сябе новых талентаў, новых самабытных твораў.

Г. ПАНОЎ,
артыст Дзяржаўнага народнага хору БССР.

ГОСЦІ МАЗЫРАН

На сцэну, здаецца, прыйшла вясна. Нібы зачараваныя, слухаюць украінскія напевы рабочыя саўгаса «Мазырскі», якія прыйшлі на канцэрт Жытомірскага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Лянок». З вялікім поспехам была паказана харэаграфічная карцінка «Таполя», выкананы ўкраінскія жартоўныя песні, сатырычныя вершы.

З поспехам прайшлі канцэрты ансамбля ў клубах «Будаўнік» і «40 год Кастрычніка».

Г. ШАРАЙ.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

Пад назвай «Горад размаўляе...» 29 студзеня г. г. у нашай газеце была змешчана заметка С. Кустановіча. У ёй адзначалася, што ў Мінску шмат адпаведных назваў розных устаноў, прадпрыемстваў, аб'ектаў. Не заўсёды вызначаецца добрым густам таксама мастацкае выкананне шыльдаў.

З Упраўлення па справах будаўніцтва і архітэктуры Мінскага гарвыканкома нам паведамілі, што пытанне, узнятае С. Кустановічам, важнае і своечасовае. Рэкламы і шыльды не толькі расказваюць пра тэатры, кіно, кафэ, магазіны і г. д., але і з'яўляюцца актыўнымі элементамі дэкаратыўнага афармлення горада.

Да 1963 года ў Мінску назвы аб'ектаў, а таксама эскізы на газасветлавыя ўстаноўкі ні з кім не ўзгадняліся. З-за бескантрольнасці ў горадзе з'явіліся шыльды-блізняты, знешні выгляд якіх не адпавядаў мастацкім патрабаванням.

Цяпер эскізы абмяркоўваюцца на мастацкім савеце, а назвы магазінаў, кафэ, рэстаранаў узгадняюцца з гарвыканкомам.

Рэстаран «Нёман», напрыклад, пераабсталёўваецца ў маладзёжнае кафэ «Сонца».

Недахопы, адзначаныя ў заметцы, гаворыцца ў пісьме ў рэдакцыю за подпісам намесніка начальніка Упраўлення Я. Заслаўскага, будуць па магчымасці ліквідаваны ў далейшай рабоце.

«Матэрыялу няма, але ён будзе»

1 снежня 1964 года ў газеце «Літаратура і мастацтва» быў надрукаваны артыкул Б. Казанава «Матэрыялу няма, але ён будзе». Артыкул быў разгледжан прамыслова-транспартным аддзелам Магілёўскага абкома КПБ і прызнаны памылковым. «Тав. Катляроў А. М., працуючы начальнікам цэха на заводзе «Сроммашына», дапусціў рад парушэнняў гаспадарчай дзейнасці, — пішуць ў рэдакцыю загадчык аддзела В. Панноў. — Рашэннем партыйнага камітэта і загадам дырэктара завода на яго зусім абгрунтавана былі накладзены дысцыплінарныя спагнанні. Прадузятых адносін і цкавання тав. Катлярова з боку кіраўніцтва завода не ўстаноўлена».

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

БАГАЦЦЕ ПАЛІТРЫ

Жывапісныя пейзажы і партрэты, гравюры на лінолеуме, дрэве, метале. Кніжная і прамысловая графіка. Афармленне тэатральных пастановак. Манументальны насценны роспіс. Эскізы інтэр'ераў і мэблі.

Спачатку насцярожвае, што адзін аўтар можа працаваць у настолькі рознай манэры і тэхніцы выканання. Тым не менш лепшыя работы маладога мастака Барыса Заборава адрозніваюцца завершанасцю, сведчаць пра своеасаблівую аўтарскую індывідуальнасць. Ён востра адчувае мнагастайныя і складаныя задачы, якія ставіць наш час перад мастацтвам. Шматграннасць творчых інтарэсаў штурхае яго на пошукі ў самых розных галінах мастацтва.

Пошукі гэтыя часам выклікаюць спрэчкі. Адным падабаецца свежасць і навізна яго твораў. Другіх яна шакіруе. Прыхільнікі пэўных агульнапрынятых норм у мастацтве схільныя за гэта ўпікаць маладога мастака. Але так або інакш работы Барыса Заборава нікога не пакідаюць абыякавым.

Забораў захапляе эмацыянальнасцю. Ён умее бачыць прыгажосць жыцця ў яго не трывіяльных, не павярхоўных праявах. Тонкі лірык, трохі вуглаваты, задумлівы, часам ледзь насмешлівы, ён афарбоўвае сваім настроем убачанае і ніколі не капіруе яго слепа. У яго свой індывідуальны падыход да натуры. Гадзінамі можа ён блукаць па вуліцах незнаёмага горада, наглядаць заімшэлую прозелень прыбалтыйскай готыкі або цеплыню прагрэтага сонцам Бахчысарая, салёны прыпах невадаў у якім-небудзь балгарскім рыбацкім пасёлку, робячы толькі беглыя замалёўкі ў блакнот. А пасля раптам «успомніць» усё гэта на палатне — у колеры, у ракурсах, у руху, ды так вобразна, свежа, уражліва, што не верыцца — няўжо напісана гэта па памяці?

Так створана большасць жывапісных палотнаў Заборава. Большраннія з іх — серыі «Талін», «Рыга», «Вільнюс». У прыгожым рытме востраверхія дахі. Мошчаныя вузкія вулачкі, старадаўнія ліхтары, шчылкі вокан, прарэзаныя ў тоўшчы сцен. Бутэлечнага колеру масіўныя контрфорсы і чарапіца выгнутых, ажурных аркабутанаў, ледзь дэфармаваныя контуры, перспектывы... Такія «Вуліца капуцынаў», «Дахі», «Стары Талін» і іншыя работы гэтага плана.

Заборава ўразіла гатычная старына побач з самымі сучаснымі будынкамі. І не выпадкова своеасаблівая прыгажосць яе здалася яму такой дэкаратыўнай, казачнай, ледзь-ледзь «несапраўднай». Бадай, іменна ў гэтым — сучасны погляд мастака на мінулае, уменне адсунуць яго ў часе, не змешваць механічна з цяперашнім. Бо сучаснасць у мастацтве — не толькі ў тым, каб адлюстроўваць адны прыкметы сённяшняга дня.

Да таго ж аўтар зусім не пазбягае і гэтых прыкмет. Невялікі яркі ліст кардону з маляўнічым журнальным кіёскам, шырокімі вітрынамі, аўтамабілямі і прыгожа выгнутым ліхтаром люмінісцэнтнага святла на фоне знаёмых востраверхіх дахаў — гэта таксама Прыбалтыка, сёння, але не адарваная ад сваёй гісторыі, подых якой так чула ўлоўлівае мастак. А дэкаратыўнасць — натуральная манера яго пісьма, адмовіцца ад якой ва ўгоду «агульнапрынятасці» азначала б адмовіцца ад індывідуальнага бачання. Галоўнае, каб дэкаратыўнасць гэтая не ператварылася б у мастака ў штамп. Там, дзе яна прадыктавана характарам самой натуры — дэкаратыўнасць гучыць арганічна і кожны раз інакш. Напрыклад, у крымскіх пейзажах. Цёплыя, шурпатыя, абмазаныя белай глінаю сцены, прагрэтая чарапіца пакатых дахаў, падслепаватыя вакенцы, мінарэт, які ўпіраецца ў раму палатна (прыём гэты аўтар любіць). Усё гэта лепіцца да шэра-жоўтага вашняку ўзгорка, ствараючы спакойны, мяккі, «адвечны» рытм.

Чатыры выразныя чалавечыя постаці напаўняюць гэтае застылае знойнае марыва старажытнага Бахчысарая чалавечым цяплом і дыханнем. Там, за гэтымі глінянымі сценамі, — сваё жыццё. Аўтар не спрабуе яго «абнародаваць». Ён тактоўна наглядае здалёку, як бы баючыся парушыць яго сваім утаржэннем. І ў гэтым таксама асаблівая манера Заборава — нешта недагаварыць, наштурхнуць гледача на роздум, ледзь-ледзь «заінтрыгаваць».

А вось той жа Бахчысарай, убачаны па-іншаму, у дынамічным развароце дамоў, у вулцы з гарбатым мостам і фігурай татарына з каровай. Тыя ж вострыя мінарэты, шурпата белыя сцены і плоскія чырвоныя дахі. А ў кавалку сіняга неба адчуваюцца вецер, далячынь, а за імі, недзе ўнізе, мора...

У Заборава свая крымская тэма, свой крымскі матыў, навеяны блуканнямі па гэтай старажытнай зямлі.

Настроі гэтыя доўга яшчэ жывуць у мастаку. Яны даюць сябе адчуць у яго балгарскіх эцюдах. Гэта натуральна. Чымсьці роднящь Стары Крым са старадаўняй балгарскай зямлёй генуэзскія вежы і мінарэты, татарскія тыпы, прылепленыя да скалаў рыбацкія пасёлкі, тое ж сонца, і тое ж Чорнае мора.

І ўсё-такі гэтае знешняе падабенства некаторых работ Заборава насцярожвае.

Толькі ў апошняй карціне «Рыбакі», закончанай ужо дома, Балгарыя па-новаму раскрылася ў жывапісе мастака. Да гэтай карціны хочацца прыгледзецца асабліва пільна. Забораў рэдка звяртаецца да шматфігурных кампазицый, персанажы ў яго пейзажах часцей проста адцяняюць той або іншы настрой і па-свайму значэнню яны другарадныя, дапаможныя. «Рыбакі» ж населены, напоўнены дзеяннем, актыўным жыццём. Але мастак не спрабуе ператвараць палатно ў традыцыйную жывапісную пастаноўку мізансцэнамі і сюжэтнымі завязкамі. Ён застаецца верны сабе — пазбягае літаратурнасці і ілюзорнасці адлюстравання, свядома захоўвае грань між адлюстраваннем і рэальным жыццём, разумеючы, што ў адваротным выпадку парушыў бы неабходную ў любым мастацтве ўмоўнасць.

У гэтым прынцыповае стаўленне Заборава да выяўленчага мастацтва ўвогуле. І з ім нельга не пагадзіцца. Умоўная плоскасць і дэкаратыўнасць у карціне вызначаюць тую неабходную адлегласць, з якой яе трэба ўспрымаць. Вобраз у ёй раскрываецца праз спецыфічныя выразныя сродкі — супастаўленне колерных і кампазіцыйных рытмаў, пластыку рухаў, суразмернасць плоскасцей. Спакойны пярэдні план — масіўныя камяні, шчыльная маса вады, цяжкія баркасы — як бы падкрэслівае манументальнасць фігур старой з малым і рыбака, які тут сядзіць. Стрымліваемая трывога і жыццёвая мудрасць пранізваюць іх твары і позы. А жыццё ідзе сваёй чаргой. Яго працоўны рытм, быццам пругкія хвалі, плыве побач — у поступе рыбакоў з цяжкім невадам, у складках развешаных сетак, акругласці лодак на беразе. Гэта — другі план. Ад яго мелодыя імкнецца ўверх, пераходзіць у іншую танальнасць, рух пайшоў у адваротным кірунку. Рытм трэцяга плана ўжо лёгкі, хуткі, адрывісты: ідзе вослік па вуліцы, спяшаюцца рыбачкі з кашамі на галовах, палошчацца ўдалоў вуліцы на вяроўцы бялізна. Мелодыя завяршаецца ў мажорным рытме дамоў, каляровых плям сцен і дахаў.

Складанасць, шматпланавасць гэтых сугуччаў не стамляе. Яна, уласна, і не ўспрымаецца так разумова, а жыве ў падтэксце, змякчаецца непрадузятасцю апавядання, у якім сур'ёзнасць суседкуе з наіўнасцю, з добраю ўсмешкай.

Гэтая своеасаблівая наіўнасць і ўсмешка адчуваюцца і ў іншых карцінах Заборава: «Пастушок», «Старая», «Манашкі». Есць у іх нешта ад успрыняцця дзяцінства. Не выпадкова з такой хуткай «хлапчукоўскай» выдумкай ілюструе Забораў дзіцячыя кнігі. Бадай, лепшыя ў яго ілюстрацыі да «Нязнайкі і Гуляйкі» А. Кобец-Філімонавай. Яны далёкія ад наўмыснай інфантыльнасці, хаця і зроблены вельмі па-дзіцячаму. Мастак быццам бы гаворыць з дзецьмі як роўны з роўнымі яркаю вобразнай мовай, разлічанай на кемлівасць і пачуццё гумару маленькага чытача і гледача, выключаючы ў адносінах да дзяцей ментарскі, павучальны тон.

Б. ЗАБОРАЎ. Партрэт Ул. Маякоўскага.

Кніжнай графікай Барыс Забораў займаецца даўно, гворчасць яго ў гэтай галіне выходзіць за рамкі непасрэднага ілюстравання. Ён падыходзіць да кнігі як мастак-канструктар, наследуючы лепшыя традыцыі майстроў паліграфічнага мастацтва. Ілюстрацыі для яго ніколі не з'яўляюцца самамэтай — яны толькі элемент мастацкага вобраза кнігі ў цэлым, уключаючы яе фармат, падбор і размеркаванне шрыфтоў і іншых кампанентаў.

У гэтым сэнсе, апроч шматлікіх зборнікаў вершаў і прозы беларускіх аўтараў, паказальныя з добрым густам афармленыя Барысам Заборавым томікі Шэкспіра на беларускай мове: «Гамлет» і «Санеты». Для гэтых выданняў мастак выканаў на дзіва тонкія і адмысловыя гравюры на метале. У іх добра перададзена эпоха, сам дух шэкспіраўскай паэзіі, яе стылявыя асаблівасці.

Забораў у гравюрах добра адчувае матэрыял, ці гэта будзе лінолеум, ці дрэва або метал. Ён умее выяўляць спецыфічныя ўласцівасці матэрыялу і знаходзіць дакладныя гравіравальныя прыёмы для кожнага канкрэтнага вобраза. У адных выпадках ён старанна апрацоўвае кожны штрых, дабіваецца класічнай строгасці і ювелірнай пекнаты. Ён вучыцца гэтаму ў лепшых майстроў савецкай і замежнай гравюры. У другіх — у яго пераважае смелая парывістасць, дынамічнасць ліній, уласцівыя яго работам у іншых тэхніках.

П

ЧАСОПІСЫ Ў ЛЮТЫМ

ПОЛЫМЯ БЕЛАРУСЬ МАЛАДОСЦЬ

ПА ТРАДЫЦЫІ знаёмім сёння нашых чытачоў з лютаўскімі кніжкамі «Полымя», «Беларусі», «Маладосці». Змест часопісаў такі:

«ПОЛЫМЯ». Вялікі, хоць і не багаты на імёны, паэтычны багаж нумара: тут змешчаны нізкі вершаў М. Танка і С. Грахоўскага. Мастацкая проза прадстаўлена пачаткам новага рамана Ул. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

У раздзеле «Успаміны, дзённікі, дакументы» друкуюцца дакументальная кніга Р. Мачульскага «Пра жывых і мёртвых», а таксама ўспаміны генерала Я. В. Леашэні аб сустрэчах у гады Вялікай Айчыннай вайны з Якубам Коласам. Артыкул І. Нісневіча аб творчым шляху Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР друкуецца ў раздзеле «У свеце мастацтва». Раздзел «Культура мовы» прадстаўлены артыкулам Ф. Янкоўскага «Слухаць жывое слова».

Багаты ў часопісе раздзел крытыкі і літаратуразнаўства. Тут змешчаны артыкул Ул. Юрэвіча «Адысея пакут і змагання» — аб кнізе Я. Брыля «Птушкі і гнёзды», рэцэнзіі П. Пестрака на кнігу Я. Васілёнка «Таццяна Ларына», Ул. Богана — на зборнік вершаў П. Панчанкі «Чатыры кантыненты», В. Чамярыцкага — на кнігу А. Крывіцкага «Наша родная мова», А. Есанова — на даследаванне М. Грынчыка «Аркадзь Куляшоў», Ф. Яфімава — на зборнік Н. Кісліка «Повесть о прессованном порохе», а таксама некалькі кароткіх рэцэнзій.

«БЕЛАРУСЬ». У часопісе, як звычайна, шмат публіцыстычных матэрыялаў. Тут друкуюцца рэпартаж М. Міхінава са Светлагорскага завода штучнага валакна, артыкул народнага артыста СССР Р. Шырмы аб Дзкадзе рускага мастацтва, якая адбылася ў нашай рэспубліцы, рэпартаж В. Чымірні з калгаса «Рассвет» Жлобінскага раёна, артыкул Б. Сокала аб Аб'яднанай беларускай ваеннай школе, што была створана па загадзе Рэўваенсавета ў Мінску ў 1921 годзе, нарыс М. Грыцана аб сям'і мужных патрыётаў Пуцейкаў, нарыс Ул. Мяжэвіча аб былых «партызанскіх дзецях» — Лілі, Тамары і Раі Дзяружных, рэпартаж А. Баравіка з гродзенскай абутковай фабрыкі «Нёман» і многія інш.

Літаратурна-мастацкі бок часопіса прадстаўлены вершамі А. Сербантовіча, Хв. Чарні, апавяданнем В. Мысліўца, вершамі літоўскага паэта Э. Матузявічуса. Надрукаваны тут таксама маленькія апавяданні В. Сямёнава, дзіцячыя вершы А. Малюка і Н. Галіноўскай, байкі П. Сушко.

У раздзеле бібліяграфіі змешчаны рэцэнзіі М. Сяржаніна на кнігу П. Калініна «Партызанская рэспубліка», М. Касцяна — на кнігу Д. Бугаёва «Паэзія Максіма Танка», Ул. Лаўрова — на зборнік Я. Васілёнка «Таццяна Ларына».

«МАЛАДОСЦЬ». Адкрываецца часопіс падборкай вершаў М. Федзюковіча. Змешчаны таксама вершы М. Маляўкі і К. Цвіркі. Друкуецца пачатак рамана А. Асіпенкі «Вогненны азімут», апавяданне І. Навуменкі «Трымценне дубовага лісця...», лірычныя эцюды А. Кулакоўскага, аўтабіяграфія А. Карпюка, гумарэска Б. Парахончыка «Віншавальны адрас».

У раздзеле «У свеце прыгожага» змешчаны артыкул І. Краўчанкі пра мастака М. Залознага. Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка друкуецца артыкул І. Хаўратовіча «Фрунзе ў Мінску». Раздзел «На абліку камунізма» прадстаўлены рэпартажам Ул. Філіпенкі «Лукомльская навіна», артыкулам І. Галко «Саюз працы і характва» і г. д. Цікавы артыкул пра М. Багдановіча друкуе Н. Ватацы.

У раздзеле «Кнігі і час» Ул. Юрэвіч піша пра лаўрэатаў прэмій імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа А. Вялюгіна, М. Аўрамчыка і П. Пестрака, Б. Бур'яна — пра зборнік вершаў Д. Бічэль-Загнетавай «Нёман ідзе», А. Макарэвіч — пра кнігу апавяданняў І. Грамовіча «Сонца скрозь воблакі».

Есць у часопісе раздзелы «Старты і фінішы», «Фотаклуб маладосці», «Шахматы», «Усмешкі маладосці».

Да нумара прыкладаецца бясплатны дадатак «А гармонік грае, грае...»

Максім ТАНК

НОВЫЯ ВЕРШЫ

НАРЫЛЬСКАЯ ТУНДРА

Тут неба нізкае, цяжкое,
Як безнадзейнасць,
ад яго
Аж гнуцца тундравыя хвоі
Ды асядаюць плечы гор.

І толькі камарыным летам,
У доўгі, незаходны дзень,
Сярод праталін тлеюць цветам
Кіпрэй,
іван-чай
ды скрыпень.

Але паслухай старажылаў,
Легендаў, песняў іх спытай,
Крані глыбей зямныя жылы—
І казачны пабачыш край.

Хоць тут суровая прырода,
Скупая, як ліхі Кашчэй,
Пад сарака замкамі лёду
Хавае скарбы ад людзей —

Народ наш — гаспадар
краіны —
Да іх свае шляхі праклаў,
І тундры, што нямела ў стыні,
Індустрыяльны воблік даў.

Тут гарады, заводы ўсталі,
Квітнець збіраюцца сады,
Ідуць стальныя вышкі ўдалеч,
Гудуць электраправады.

У гэта можа б не паверыў,
Але ў Нарыльску сам гасціў.
Сваймі нагамі тундру мераў
І з Енісеем піва піў.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Не знаю, як я стаў паштовай
скрынкай.
Усцешыўся — не трэба будзе
думаць
І непакоіцца, і хвалявацца.
Адно знай толькі — рот не
закрывай,
Карэспандэнцыю прымай
з усмешкай.

Вось першы ліст прынесла
мне дзяўчына —
О, колькі ў ім гарачых
пацалункаў!
Другі — пасланне маці свайму
сыну,
Каб не забыў пра цёплыя
шкарпэткі
І не прастыў на цаліне
далёкай.

А потым — віншавальныя
паштоўкі,
Трыкутнікі салдацкія,
паведкі
І бандэролі розныя, і зводкі...
І раптам, азіраючыся, нехта
Падбег і кінуў у канверце
чорным
Данос паклёпніцкі на чалавека.
— Гэй, затрымайце! —
крыкнуў я, і крык мой
Прагнаў заўчасна сон з маіх
вачэй.
І я не знаю, ці той ліст быў
знішчан,
Ці запынілі аўтара яго.
Мо ён і сёння ходзіць
сярод нас,
Атрымлівае пенсію за
страчанае некалі
Сумленне.

ПАХ БАРАВІКОВЫ

Дык, значыць, восень зноў
брыдзе разлогамі.
Ля печы сушацца з цыбуляй
разам
Вянкі грыбоў — лясныя
анталогіі
Неверагодных, фантастычных
казак.

Вось гэты баравік рос там,
дзе забалаць
(Пад лён зязюльчын нават
шапкі колер).
Ен можа расказаць,
як шуміць папараць
І ваўчанят вядзе ваўчыца
борам.

А гэты жыў, дзе ягадніці
сінія.
Прапах увесь п'янічнікам,
ядлоўцам.

Ен знае закуткі цецеравіныя,
Нябачныя для воч людскіх
і сонца.

А гэты быў прысыпаны
ігліцаю
На верасам расквечаным
пагорку.
Ен знае баравых таямніцы
ўсе
Пра барсука, пра дзятла,
пра вавёрку.

Я іх збіраў. І мо таму
да раніцы
Прыпамінаюцца мне ўсе
грыбныя сховы.
Дык, значыць, восень
зноў, калі ўрываецца
І ў сон і ў сэрца пах
баравіковы.

Мікола МАЛЯУКА

ЧАМУ Я ЛЮБЛЮ НАВАЛЬНІЦЫ

Навальніца, як бліцамі,
Шчоўкала бліскавіцамі.
З перасоўнай сваёй каланчы
Фатаграфавала
Лесасеку ўначы.
Фінкі
пад хмарамі палкімі
Заміралі русалкамі,
Уваходзілі ў сны —
Выціскалі ля вогнішчаў
Мокрыя валасы.

Падалі кроплі спелыя —
Сінія, жоўтыя, белыя.
Падалі ўсё глушэй
З кончыкаў пальцаў
прасвечаных,
Падалі з мочак вушэй.
Будуць да смерці прывычнымі
Мне перуны навальнічныя,
Лівень ударыць касы —
Бачу дзяўчат,
што выкручваюць
Мокрыя валасы.

Анатоль СЕРБАНТОВІЧ

НЯЗГАСНАЕ ВОГНІШЧА

Прыгода першая, як птушка:
Злавіў яе — і бачыш зноў:
Пасе гусей каза-пастушка,
Ты ж — стрыгунок—пасеш
кароў.

А восень, восень!
Хмарна, золка.
Вятры праносяцца наўскач.
Ля вогнішча густая елка
Нас атуліла, быццам плашч.

Сякуць дажджы. За кропляй
кропля,
Чуваць, за пазуху цячэ.
Два шчыглікі сядзяць упоплеч
І горнуцца шчакой к шчацэ.

Цямнеецца увачавідні.
Дым лезе ў вочы, як кастра.
А мы, змакралыя да ніткі,
Усё грэемся каля кастра...

Штось шэпча сцішана яліна —
Пара дадому статак гнаць...
І сорамна ад успаміну,
І не магу не ўспамінаць,

І часта ў снах не ель, а ёлка
Зіхценнем слепіць, трубіць
рог...
І ціха падае прыколка
Сухой ігліцай на мурог.

Былы сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі, камандзір Барысаўска-Бягомльскага партызанскага злучэння Раман Навумавіч Мачульскі напісаў кнігу ўспамінаў «Вечны агонь». Ніжэй друкуюцца ўрыўкі з гэтай кнігі.

Раман МАЧУЛЬСКІ,
Герой Савецкага Саюза.

Пра жывых і мёртвых

ЗДАРОЎЕ маё стала папраўляцца. Пачаліся дні, поўныя клопатаў. Я рыхтаваўся адлятаць у тыл ворага. Нават паспеў ужо з лётчыкам запіску В. І. Казлову, каб мяне чакалі.

19 жніўня прыйшоў у Цэнтральны штаб партызанскага руху, адшукаў там нікім не заняты пакой і пачаў склейваць карту Мінскай вобласці. Але неўзабаве адчыніліся дзверы, і пасыльны, што спыніўся ў парозе, сказаў:

— Вас тэрмінова выклікаюць у ЦК.

Першы сакратар ЦК КП(б) Беларусі, начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнка прыняў мяне адразу ж. Размова была кароткая.

— Стала вядома, што да партызан перайшла брыгада Гіль-Радзіёнава, — сказаў Панамарэнка. — Брыгада гэтая была створана немцамі з ваеннапалонных і да гэтага часу дзейнічала супроць нас. Ваша паездка ў злучэнне таварыша Казлова адмёнена. Сёння ж трэба ляцець у раён Бягомля. Вы, сакратар абкома партыі, цяпер будзеце ўзначальваць партызанскі рух у паўночных раёнах Мінскай вобласці. З вамі паляціць таксама Іван Пятровіч Ганенка.

Начальнік Цэнтральнага штаба памаўчаў трохі, нібы абдумваючы нешта, пасля зноў загаварыў:

— Вы там не вельмі спяшайцеся, дакладна высветліце, чаму брыгада Гіль-Радзіёнава перайшла на наш бок. Улічыце ўсе акалічнасці. Рабіце ўсё з такім разлікам, каб паставіць пытанне — ці можна выкарыстаць брыгаду як баявую адзінку ў складзе Барысаўска-Бягомльскага злучэння, камандзірам якога вы прызначаны.

□

Да штаба брыгады Гіль-Радзіёнава было кіламетраў пятнаццаць. Яшчэ ўранні Гіль-Радзіёнаў атрымаў паведамленне, што ў брыгаду да яго накіроўваецца таварыш з Масквы. Паехаў туды на матацыкле капітан Дамарад.

Капітан далажыў Гіль-Радзіёнаву, што з Масквы зусім нядаўна прыбылі сакратар ЦК КП(б) Беларусі, а таксама новы камандзір Барысаўска-Бягомльскага злучэння. Яны і маюць ад Цэнтральнага штаба партызанскага руху паўнамоцтвы ўстанавіць з падпалкоўнікам асабісты кантакт і сумесна абмеркаваць усе пытанні, звязаныя з далейшай баявой дзейнасцю брыгады. А пакуль што яны хацелі б атрымаць поўную інфармацыю пра брыгаду.

— Скажыце, калі ласка, аб чым іменна я павінен інфармаваць сакратара ЦК партыі і камандзіра злучэння? — спытаў Гіль-Радзіёнаў.

Дамарад адказаў:

— Цяпер я не магу дакладна сказаць вам пра тыя пытанні, якія могуць зацікавіць іх. Але камандзіры партызанскіх брыгад звычайна дакладваюць кіраўніцтву аб праведзеных баявых аперацыях і аб тых, якія яшчэ намячаюцца, таксама аб маральна-палітычным стане асабовага складу.

— Можа трэба дадаць якую пісьмовую справаздачу? Ці абмежавацца вусным паведамленнем, у прыватнасці пра гісторыю ўзнікнення нашай брыгады?

— Вы самі лепш вызначыце, якім відам інфармацыі зручней карыстацца. А што датычыць паведамлення аб гісторыі ўзнікнення брыгады, то гэта, бясспрэчна, зацікавіць упаўнаважаных Цэнтральнага штаба партызанскага руху.

Мы спадзяваліся, што Гіль-Радзіёнаў збярэцца да нас у той жа дзень — 20 жніўня — або ў крайнім выпадку на другі дзень. Але ён прыехаў толькі апоўдні 22 жніўня. Капітан Дамарад тым часам знаходзіўся ў брыгадзе. Гіль-Радзіёнаў, паведамляў Дамарад, грунтоўна рыхтуецца да сустрэчы, складае важны дакумент і раіцца са сваімі афіцэрамі.

За два дні, якія пражылі ў партызанскай зоне, мы добра пазнаёміліся са справамі ў брыгадзе «Жалязняк». Сустрэліся з сакратаром Барысаўскага міжраённага камітэта партыі П. А. Жуковічам, які расказаў аб рабоце міжрайкома, партыйных арганізацый у брыгадах і атрадах.

Аблюбаваўшы добры лужок каля штаба брыгады, мы з Ганенкам вывучалі па карце дыслакацыю партызанскіх брыгад і атрадаў паўночных раёнаў вобласці. Апоўдні раптам пачуўся гул матора. Да штаба падкаціў нямецкі грузавік, у кузаве якога было каля дзесятка чалавек. Капітан Дамарад і два незнаёмыя афіцэры накіраваліся да нас. За імі на некаторай адлегласці ішлі пяць аўтаматчыкаў у нямецкай форме з чырвонымі нашыўкамі на рукавах.

Першы да нас падышоў высокі і статны шэравокі бландзін, якому было год можа трыццаць сем ці больш. На ім было чорнае скураное палітo, на галаве шапка, якую носяць афіцэры пяхотных часцей Савецкай Арміі, з новай чырвонай зоркай. Боты былі начышчаны да бляску. На баку вісеў «Кольт» у доўгай драўлянай кабуры. На грудзях матляўся вялікі цэйсаўскі бінокль.

— Гіль-Радзіёнаў, Уладзімір Уладзіміравіч, камандзір брыгады, — адрэкамендаваўся бландзін і ўзяў пад казырок.

Мы назвалі сябе. Павіталіся. Іван Пятровіч запрасіў і гасцей і партызан сесці.

— Тое, што адбылося 16 і 17 жніўня ў брыгадзе, якой я камандую, вы ведаеце, — пачаў Гіль-Радзіёнаў. — Я асабіста і мае падначаленыя — афіцэры і радавыя, і тыя, у каго ёсць віна перад Радзімай, і тыя, у каго няма ніякай віны перад ёю, — поўныя рашучасці змагацца з акупантамі ў радах беларускіх партызан. Разам з тым нас хвалюе пытанне, ці даруе нам Радзіма, што мы больш за год ваявалі супроць яе абаронцаў — партызан.

— А як гэта здарылася, што вы — савецкі афіцэр — апынуліся па той бок барыкад і, як кажаце, больш за год змагаліся з партызанамі? — спытаў Ганенка, не спяшаючыся даваць адказ на пастаўленае пытанне: пакідаў гэта да больш зручнага моманту.

Гіль-Радзіёнаў уздыхнуў, падумаў трохі і пачаў расказваць. Вайна застала яго на пасадзе начальніка штаба 229-й стралковай дывізіі. У адным з баёў, недзе паміж Талачыном і Сянно, ён быў паранены і ўзяты ў палон. Разам з групай чырвонаармейцаў і камандзіраў трапіў у сувалкаўскі лагер. Гітлераўцы катавалі нашых салдат, марылі іх голадам, па некалькі дзён не давалі вады. Знясіленыя ваеннапалонныя пачалі паміраць. Тады ў лагеры і паявіліся фашысцкія афіцэры. Яны гаварылі: «Вас чакае галодная смерць. Калі не хочаце здохнуць, пераходзьце да нас, памагайце вялікай Германіі. Мы ствараем «Рускую вызваленчую армію». Ідзіце ваяваць з бальшавікамі. Германія ацэніць вашы заслугі!».

Але савецкія салдаты маўчалі. Ніхто не адказаў на правакацыйныя заявы. Фашысты пачалі з яшчэ большай лютасцю распраўляцца з палоннымі. Метады катаванняў удасканальваліся з кожным днём. Галодная смерць бязлітасна касіла людзей. Тыя, у каго яшчэ было трохі сілы, штодня, як займалася раніца, зімалі з нараў і выносілі з блокаў сваіх мёртвых таварышаў.

І вось у лістападзе 1941 года ў Гіля нарадзілася думка — даць згоду на стварэнне нацыяналістычнага фарміравання пад яго ж камандаваннем: ён спадзяваўся, што гэткім чынам здолее вывесці з лагера шмат палонных, скамплектуе з іх брыгаду, а можа і дывізію, атрымае ад немцаў зброю, а пасля, скарыстаўшы зручны выпадак, пяройдзе лінію фронту і зноў апынецца ў радах Чырвонай Арміі. І Гіль паведаміў аб сваёй згодзе нямецкаму камандаванню. Спачатку яго прызначылі рускім начальнікам сувалкаўскага лагера ваеннапалонных. Тады ж Гіль пачаў называцца таксама Радзіёнавым, дакладней Гіль-Радзіёнавым. Вакол яго імя немцы распачалі вялікую шуміху. Яны выстаўлялі савецкага афіцэра «героем» і выкарыстоўвалі яго імя для антысавецкай агітацыі сярод ваеннапалонных. Ды і сам ён, па сутнасці, быў ужо рупарам фашысцкай прапаганды, калі звяртаўся да ваеннапалонных з прапановай уступіць у вайсковае злучэнне, якое ён стварае. Гітлераўцы патрабавалі ад яго таксама і палітычнай праграмы, якую ён павінен быў выкласці на паперы: за якія мэты ён і «рускае злучэнне» маюць намер змагацца. Давялося напісаць праграму.

— Як бачыце, — сказаў нам Гіль-Радзіёнаў,— я думаў пра адно, а атрымалася штосьці зусім процілеглае, і сам я апынуўся ў стане ворага. Невясёлая гэта і доўгая гісторыя. Можа вы лепш пазнаёміцеся з дакументам, які я падрыхтаваў.

Гіль-Радзіёнаў дастаў з кішэні скуранога палітo некалькі старонак машынапіснага тэксту, падаў Ганенку.

Дакумент, які Іван Пятровіч пачаў чытаць, меў вельмі доўгую назву: «Даведка аб узнікненні 1-й антыфашысцкай брыгады і спіс кіруючага складу так званага Саюза рускіх нацыяналістаў і Першай рускай нацыянальнай брыгады, што перайшла на бок партызан усім складам».

— Дык вы былі не толькі камандзірам Першай рускай нацыянальнай брыгады, але і арганізатарам і кіраўніком Саюза рускіх нацыяналістаў? Ці не занадта многа для аднаго чалавека? — спытаў Ганенка.

— Без ідэйнай падаплёкі немцы не дазволілі б мне фарміраваць з ваеннапалонных такія падраздзяленні, як дружына, полк і брыгада. А ўвогуле лічыце «Саюз» маім мёртванароджаным дзіцем,— адказаў Гіль-Радзіёнаў.

— Нішто сабе «мёртванароджанае дзіцё», якое здольна само нараджаць дружыны, палкі і нават брыгады, — амаль са злосцю пакпіў Ганенка.

Настала няёмкая цішыня. Гіль-Радзіёнаў не ведаў, як адказаць, і маўчаў. Маўчалі і мы.

— І ўсё ж вы надта позна перайшлі да партызан, — нарэшце сказаў я Гіль-Радзіёнаву, спрабуючы памагчы яму пераадолець разгубленасць. — Варта было зрабіць гэта адразу ж, як толькі апынуліся ў Беларусі. Тады і ў вас асабіста і ў вашых падначаленых менш было б памылак, і партызаны страт ад вас не мелі б.

— Я з вамі згодны. Позна. Але, як кажуць, лепш позна, чым ніколі, — адказаў Гіль-Радзіёнаў.

Памякчэў трохі і Ганенка. Сказаў:

— Вы апынуліся ў надта складаным становішчы. Але выйсце з яго, хоць і позна, знайшлі правільнае.

— Я вас разумею, — згадзіўся Гіль-Радзіёнаў, — і вельмі прашу прыехаць у нашу брыгаду, каб бліжэй пазнаёміцца.

Падышлі кіраўнікі брыгады «Жалязняк», і размова наша з Гіль-Радзіёнавым перапынілася. Нас запрашалі на абед.

Пасля абеду Гіль-Радзіёнаў развітаўся і паехаў.

На трэці дзень паехалі ў брыгаду Гіль-Радзіёнава і мы з Ганенкам.

— Цікава, як там нас сустрэнуць? Ці правільна мы зрабілі, што не ўзялі з сабой аховы? — занепакоіўся я.

— Калі што здарыцца, ахова мала паможа, — адказаў Іван Пятровіч. — У мяне складаецца ўражанне, што пераход Гіль-Радзіёнава на наш бок—факт, які ўжо адбыўся, і што асабіста ён шчыра раскайваецца ў тым, што нарабіў, і рашыў крывёю загладзіць сваю віну перад Радзімай.

У размовах мы і не заўважылі, як праехалі немалую — пятнаццаць кіламетраў—дарогу. Вось і штаб брыгады. Насустрач выйшаў Гіль-Радзіёнаў. Ветліва запрасіў у штаб. А тым часам па падраздзяленнях брыгады паляцела чутка: з Масквы прыбылі работнікі Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і прадстаўнікі Цэнтральнага штаба партызанскага руху. Да штаба пачалі сыходзіцца афіцэры і салдаты.

На гэты раз размова паміж намі і Гіль-Радзіёнавым была кароткая. Ганенка сказаў камандзіру брыгады і штабным афіцэрам:

— Камуністычная партыя і Савецкі ўрад ніколі не глядзелі і не глядзяць на байцоў і камандзіраў, якія трапілі ў палон да праціўніка, як на здраднікаў Радзімы, а лічаць іх савецкімі людзьмі, якія апынуліся ў руках ворага і часова выйшлі з бою. Калі хто-небудзь з ваеннапалонных зрабіў злачынства перад Радзімай, то павінен загладзіць сваю віну ў будучых баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі і Цэнтральны штаб партызанскага руху лічаць, што пераход да партызан — не гераізм, а толькі імкненне вярнуцца ў строй байцоў, якія змагаюцца з фашызмам, і пачатак рэабілітацыі для тых, хто адчувае за сабою якую-небудзь віну перад савецкім народам.

— Якія вашы планы на будучае?—спытаў я ў Гіль-Радзіёнава.

— Мы б хацелі,—сказаў ён,—каб, па-першае, наша брыгада была ўключана ў склад Барысаўска-Бягомльскага партызанскага злучэння, з партызанамі якога салдаты і афіцэры брыгады мелі найбольш цесныя сувязі да пераходу ды і сам пераход зрабілі на вачах у байцоў і камандзіраў гэтага злучэння, а па-другое—каб ёй было нададзена званне Першай антыфашысцкай партызанскай брыгады.

— Лічыце і першую і другую вашы просьбы задаволенымі,—сказаў Ганенка і кіўнуў на мяне.— Перад вамі сакратар Мінскага падпольнага абласнога камітэта партыі і камандзір злучэння. Усе распараджэнні абкома і штаба злучэння будзеце атрымліваць ад яго. А што да таго, як называць брыгаду, то першыя баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Докшыцах і Круляўшчызне даюць вам права насіць гэтую ганаровую назву, і спадзяюся, што байцы і камандзіры брыгады праславяць яе ў баях з ненавісным ворагам.

Мы захацелі таксама пагаварыць непасрэдна з салдатамі і афіцэрамі брыгады, пазнаёміцца з іх настроем, высветліць, як яны самі ўспрымаюць усе гэтыя перамены ў сваім жыцці. У суправаджэнні Гіль-Радзіёнава накіраваліся ў падраздзяленні. Было нязвыкла глядзець на нашых савецкіх людзей у фашысцкай форме. Усюды вакол нас збіраліся групы байцоў і камандзіраў. Пытанні яны задавалі самыя розныя. А мы, вядома, стараліся даць на іх самыя вычарпальныя адказы. Па ўсім было відаць, што людзі перажывалі вялікую радасць з прычыны пераходу да народных мсціўцаў.

У той жа дзень Гіль-Радзіёнаву быў дадзен загад размясціць брыгаду ў Плешчаніцкім раёне.

Малюнкі мастака Фёдара Бараноўскага рачана Алеся Асіпенкі «Вогненны азімут».

Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ

КРАСАВІК

Красавік,
Ціха плачуць сумёты.
Гулка пляскаюць капяжы,
Ля сасонак,
сутулых, самотных,
неўгамонны раўчук бяжыць.

Ён, як хлопчык гарэзны, — звонкі,
сінявокі, светлагаловы.
Задуменна глядзяць сасонкі,
уздыхаюць, нібыта ўдовы.

Прыгадалі юнацтва,
пэўна,
вайною знявечанае...
Бесклапотны раўчук упэўнена
пяе з ранку да вечара.

Сосны слухаюць — усміхаюцца,
небасхіл зяяе промнямі.
— З добрай раніцай!
— З мірнай раніцай! —
дрэвы сонцу ківаюць кронамі.

Зіма-бабуля рыпіць, скрыгоча.
Спраўляе красавік заручыны.
Сягоння свята:
ў каравул я крочу —
мне ахоўваць вясну — даручана.

У НОВЕНЬКІХ пагонах старшыны і з бліскучым чамаданам у руцэ я ступіў, нарэшце, на драўляны тратуар роднай вуліцы. Некалі я пісаў ужо, што наш гарадок невялікі, ціхі і знаходзіцца ў тым месцы рэспубліці, якое завецца перыферыяй. І ўсё ж за час пакуль я адбываў тэрміновую вайсковую службу, гарадок паспеў двойчы, як кажуць, перайсці з рук у рукі. Не думайце, што тут сапраўды адбываліся нейкія баталіі. Не. Першы раз гарадок «здаўся», калі пасля расфарміравання раёнаў адсюль перавялі райцэнтр. Ну, а другі раз «перамог» — гэта калі цэнтр раёна пераехалі назад.

Значыць, я вярнуўся ў матчын дом два дні прымаў гасцей, сяброў і ўсіх, хто хацеў на мяне зірнуць, а на трэці дзень засумаваў без справы. Мой былы аднакашнік і сябар, сакратар райкома камсамола Мікола Зубрык сустрэў мяне, як свайго выратавальніка, з абдымкамі і нават ключ павярнуў у дзвярах, каб я не ўцёк.

— Ты наконт працы? Дык гэта ж цудоўна! Цябе сам бог паслаў!

Не даючы сказаць ні слова, ён пасадзіў мяне ў крэсла насупраць свайго стала, адсунуў убок тэлефонны апарат і запытаўся:

— Ты ў арміі быў старшыною?

— Так. Быў.

— Цудоўна! Проста мне шанцуе сёння...

Не разумеючы, куды Мікола хіліць, я не мог падзяліць яго захапленне, таму круціў у руках шапку, маўчаў і слухаў.

— Ты перад арміяй вучыўся ў вобласці на кароткатэрміновых курсах гандлёвых работнікаў?

— Так. Вучыўся. Месяц... Не скончыў...

— Нічога, нічога!—замахаў рукамі Мікола. Пасля выскачыў з-за стала, абняў мяне за плечы і ўмольна зірнуў у вочы:

— Выручы, Базыль, век цябе не забуду!

— А-а што ў цябе такое? У чым цябе выручаць трэба?—затрывожыўся я.

— Ведаеш, баюся казаць, але

Базыль ПАРАХОНЧЫК

Віншавальны адрас

ГУМАРЭСКА

рубану прама, па камсамольску.— Ен выцер спацелы лоб, сеў на сваё месца, закурыў і працягваў: —Ты памятаеш, як гады тры назад у нас пачалі будаваць магазін?

— Ну, памятаю...

— Дык вось... Нядаўна, як райцэнтр пераехаў сюды, яго закончылі, і ён пачаў працаваць. Але як! Няма ніводнага талковага прадаўца. Я маю на ўвазе адукаванага спецыяліста. Кожны тыдзень скаргі...

Я, нарэшце, скумекаў, куды гне Мікола, але не ведаў, што ён скажа далей. А ён працягваў:

— Я хачу цябе па камсамольскай пуцёўцы паслаць на працу ў новы магазін. Старшым прадаўцом. Ты быў старшыною, ты вучыўся на курсах...

— Прабач, але ж я вучыўся на бухгалтара...

— Нічога, нічога, не бойся... Пабудзеш з год прадаўцом, навядзеш парадак за прылаўкам... А тады... тады мы цябе ад імя райкома пашлём вучыцца ў гандлёвы інстытут. Перспектыва! Згаджайся, адразу даю пуцёўку!..

Перспектыва была заманлівая. Але як толькі я ўявіў сябе, апранутага не ў падагнаны афіцэрскі шынель, які я насіў, карыстаючыся паблажлівасцю начальства, а ў сіні памяты халат з нішэнькамі, мне стала няўтульна і холадна. Я нават прыўзняўся. Але Мікола пасадзіў мяне на месца:

— Ты камсамолец? Ты свядомы?

— Так, свядомы...

— А ты ведаеш, што ў нашым раёне дзевяць камсамольцаў даярамі працуюць і два свінарамі?..

— Н-не ведаю...

— Дык ведай... Яны свядомыя, яны самі пайшлі... А ты... Эх, ты!..—Мікола, як здалося мне, нават слязу выцер. Мне стала шкада сябра.

Першы тыдзень я прымаў тавары для продажу ў сваім аддзеле. Ну, а папаўся мне аддзел самы турботны—верхняе мужчынскае і жаночае адзенне... Памагалі мне суседка злева—Зінчка з галантарэі і суседка справа—Верачка з гаспадарчага аддзела. Загадчык магазіна Сямён Сямёнавіч час ад часу выходзіў з невялікага пакойчыка, пазіраў на нашу мітусню і ківаў галавою:

— Кіньце вы так пільна ўсё пералічваць, тавары нідзе не дзенуцца. Галоўнае, каб іх куплялі, тады ўсё будзе ў парадку.—Затым загадчык звяртаўся да мяне асабіста:—Вы малады прадавец, а я, можна сказаць, вырас за прылаўкам. Вось вам мая парада: не давайце пакупніку апамятацца. Талент прадаўца ў тым і заключаецца, каб умела і хутка збыць самы не ходкі тавар і выканаць план.

Сямён Сямёнавіч хітра падмігнуў, а я сумна ківаў галавою і моўчкі перавешваў з месца на месца даўгаполыя палітo дапатопнага ўзору, шырачэзныя штаны, пінжакі з высокімі ватнімі плечукамі і круглыя зялёныя паўвайсковыя шапкі. Усё гэта былі вырабы мясцовай арцелі, і мой заўтрашні дзень паўставаў перада мною ў змрочных фарбах. Але адступаць было позна.

Сваіх пакупнікоў я абслугоўваў ветліва і культурна. Асабліва мужчын. Я па некалькі разоў вадзіў іх у прымерачную, круціў перад люстэркам, каб хоць як-небудзь падагнаць мешкаваты і даўгі пінжак або шырачэзнае палітo. Я хацеў, каб вопратка сядзела на кожным з іх, як на маіх салдатах, якім не так яшчэ даўно падбіраў абмундзіраванне. Жанчын і дзяўчат мне дапамагала апранаць у мясцовыя вырабы суседка злева—Зінчка. Нам было цяжка збываць заляжалы тавар. Пакупнікі часта вярталі вопратку назад і патрабавалі свае грошы. Сямён Сямёнавіч у такіх выпадках злаваўся, коса пазіраў на мяне і на маю дабравольную памочніцу. І ўсё ж грошы вяртаў, а пакупку вешаў на ранейшае месца:

— Прыйдзе зіма, тады ўсё забяруць. Мароз прымусіць. Не паедуць жа яны за дзвесце вёрст у горад...

Так прайшоў месяц, настала зіма. Каб хоць чым-небудзь памагчы кліентам, я ўгаварыў сваіх суседак, і, седзячы кожны вечар да поўначы, мы перашывалі калечаныя пры нараджэнні палітo, касцюмы і сукенкі. Пакупнікі бралі іх, часам дзякавалі нам. Але часцей за ўсё патрабавалі кнігу скаргаў. «Дайце ім кнігу, няхай пішуць!»—гаварыў загадчык. І мы давалі кнігу. За квартал яна была спісана амаль да палавіны. Калі мы чыталі ўсе гэтыя запісы, нам, прадаўцам, не хацелася жыць на свеце і сорамна было выходзіць на вуліцу. Затое загадчык магазіна, гартаючы запісы, толькі з'едліва ўсміхаўся:

— Ну, ну, няхай пішуць... Цяпер граматных шмат....

Я назваў Сямёна Сямёнавіча бюракратам, і ў выніку нашы адносіны пагоршыліся. Аднойчы загадчык нават зрабіў мне вусную вымову. Гэта калі я кінуў прылавак і пабег на вуліцу даганяць вясковага дзядзьку, каб аддаць яму рашту, якую той у спешцы забыў. Дзядзька думаў, што я даганяю яго, каб забраць назад палітo, і пусціўся наўцёкі. Умяшаліся прахожыя. Пакуль усё высветлілася, адбыўся невялікі скандал.

«Вы кампраметуеце наш магазін!»—сказаў мне загадчык. І ўсё ж я працягваў сваю гандлёвую дзейнасць. Працягваў, каб дабіцца культурнага абслугоўвання пакупнікоў і, галоўнае, каб атрымаць для ўсіх іх добрыя рэчы на складзе ў вобласці. Я нават свайго сябра, сакратара райкома Міколу Зубрыка, хацеў уцягнуць у гэтую справу. Але той толькі замахаў рукамі:

— Братка, няма часу... Канферэнцыя на носе... Правяду, а тады возьмемся...

Скаргі ў магазіне раслі, тавары віселі, загадчык па-ранейшаму пасміхаўся, а я пачаў худзець і перастаў брыцца. Так было яшчэ з месяц. А тады... Тады адбыўся выпадак, які нечакана дапамог.

Неяк падвечар мяне выклікалі да раённага начальства па гандлю і спыталі:

— Вы ведаеце, што сёння ў Сямёна Сямёнавіча юбілей?

— Не ведаю,—адказаў я.

— Мы так і ведалі, што вы не ведаеце. Дык вось слухайце:—Сёння ў раённым Доме культуры ўсе работнікі гандлю збяруцца на сход, каб павіншаваць вашага загадчыка з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння і трыццацігоддзем гандлёвай дзейнасці. Падрыхтуйце вось тані віншавальны адрас... Усё, можаце ісці.

Я схапіў паперку, што мне падсунулі, і пабег у магазін.

Гадзін да сямі вечара мы сядзелі ўтраіх і перапісвалі ў тоўстую цыратавую папку віншаванне свайму начальніку.

«...Адзначаючы Вашу шматгадовую...», «...Вы моцна стаялі за прылаўкам...», «Вы адзін з тых, хто ні разу не сеў на інтарэсы працоўных...» Адрас быў даўжэзны. Мы скончылі яго перапісваць якраз тады, як пазванілі з райгандлю, што вечар пачынаецца. «Бяжым!»—загадаў я сваім суседкам і кінуўся зачыняць магазін. Зіна і Вера хуценька сабраліся.

Вечар быў што трэба. Прэзідыум, аркестр, публіка. Седзячы на сцэне побач з гандлёвым начальствам, я не зводзіў вачэй з юбіляра. Ен быў сапраўды, як імяніннік: памаладзеў, апрануўся ў святочнае. Чыталі даклад, чыталі прывітанні. Грымела музыка і апладысменты

ЦЫРК НА ЛЁДЗЕ

У адным з нумароў нашай газеты паведамлялася аб анонсе новага, не зусім звычайнага цыркавога паказу. І вось у мінулую суботу, нарэшце, адбылася яго прэм'ера ў памяшканні Мінскага дзяржаўнага цырка.

... У святле яркіх пражэктараў блішчыць гладкая, як шкло, лёдавая арэна. Гучыць уверцюра. І пад гукі жыццярадаснай музыкі на манеж выязджаюць на каньках некалькі дзесяткаў стройных і прыгожых юнакоў і дзяўчат. Гэта — парад удзельнікаў маладога творчага калектыву, які з дапамогаю Цэнтральнай студыі цыркавога мастацтва стварыў першую ў нашай краіне праграму «Цырк на лёдзе».

Артысты-выканаўцы, шырока выкарыстоўваючы тэхніку фігурнага катання, элементы цыркавога мастацтва і сродкі харэаграфіі, паказалі шмат разнастайных, запамінальных нумароў. У першым аддзяленні былі выкананы рад масавых і ансамблевых нумароў. Сярод іх эксцэнтрычны танец «Каты і кошачкі», «Факстрот», «Ля самавара», «Руская масленіца». Артысты Ул. Яноўскіс і М. Ручкін паказалі камедыйную сцэнку «Першыя крокі на лёдзе». Дрэсіроўшчык А. Маёраў выступіў разам са сваімі дрэсіраванымі мядзведзямі-фігурыстамі. У другім аддзяленні мінчане ўбачылі «Пушкінскі вальс», «Акрабатычны танец», танец «Містраль», а таксама рад нумароў цыркавога жанру.

На здымку — танец «Румба» ў выкананні артыстаў І. Булашэвіч і Б. Якаўлева.

Фота Ул. КРУКА.

РОДНАМУ ГОРАДУ

Васьміметровы манумент «Да зорак», выкаваны самадзейнымі скульптарамі Пятром Канстанцінавічам Скарынкам і яго сынам Юрыем, устаноўлен у цэнтральнай частцы горада Валожына. На пастаменце ў шламафонах стаяць два касманаўты. Іх позіркі накіраваны ў вышыню.

Манумент «Да зорак» — не першая работа самадзейных скульптараў. У раённым цэнтры можна сустрэць і іншыя іх творы.

Петр Канстанцінавіч — па прафесіі настаўнік, фізік і матэматык.

— Я з жонкай — на пенсіі, сыны працуюць у майстэрнях «Сельгастэхнікі», — расказвае Петр Канстанцінавіч, — старэйшы — слесарам, малодшы Юрый — інжынерам. Юрый жыве са мной і маці. З ім мы і «мастачым».

— Пасля заканчэння дзесяцігодкі,—расказвае Юрый,—я два гады прапрацаваў у мастацкіх афармленчых майстэрнях. Пазней, ужо будучы студэнтам, пачаў самастойна прабаваць сілы. Разам з бацькам пяць гадоў назад змайстраваў сваю першую работу—кветкавую вазу. Яна і цяпер стаіць у гарадскім скверы. Праз год зрабілі вялікі фантан са скульптурнымі групамі. Назвалі мы яго «Пад мірным небам». Ён таксама ўпрыгожвае цэнтр нашага горада.

Плёна папрацавалі скульптары летам мінулага года. У двары раённай бальніцы пабудавалі фантан, а ля дзіцячага аддзялення—скульптурную групу на тэму «Доктар Айбаліт». Цэлы шэраг работ упрыгожвае тэрыторыю і карпусы майстэрань «Сельгастэхнікі». Тут і барэльефы, і дэльфін ля плавальнага басейна, і фантан «Снап».

Трэба адзначыць, што ўсё гэта энтузіясты выканалі бясплатна, працуючы ў вольны час. Цяпер самадзейныя скульптары распрацоўваюць праект афармлення дзіцячага сада.

Н. РЫДЗЕЎСКІ,
спецкар. БЕЛТА.

МАЛЮНКІ АРМЕЙСКІХ МАСТАКОЎ

Творчасць армейскіх самадзейных мастакоў і фотааматараў прадстаўлена на выстаўцы, экспанаванай у Мінскім акруговым Доме афіцэраў. Гэта жываліс, графіка, вучэбныя малюнкі і акварэлі.

Адразу ж скажу, што малюнкі гіпсавых і анатамічных галоў недасканалыя па тэхніцы выканання. Вучэбныя нацюрморты — лепшыя, асабліва выкананыя ў тэхніцы акварэлі. Сярод іх выдзяляюцца работы В. Хараненка, Д. Маліноўскага, Ф. Харытончык, Э. Астаф'ева. Добрае ўражанне пакідаюць накіды аднатоннай акварэллю (грызайль), пяром, алоўкам, пэндзалем, розныя эцюды і эскізы на тэмы сучаснага армейскага жыцця, а таксама пейзажы. Лепшыя з іх—работы А. Цуканава, В. Каваленкі, Л. Раманава, Э. Сільчанкі.

Вось накіды з натуры «Палявая кухня», «Танкі», «Салдацкі абед», выкананыя яфрэйтарам А. Сухен. Яны сведчаць пра пільнае вока аматара выяўленчага мастацтва. Добрае пачуццё колеру, адчуванне стану прыроды, валоданне матэрыялам выяўляюцца ў шматлікіх эскізах (напрыклад, «Марш», «Тэхнічная дапамога» А. Сальнікава, «Мары» А. Блых і інш.).

Асобна хочацца спыніцца на работах капітана запасу І. Здзсенкі. Палотны яго змястоўныя. Праўда, яны ў цэлым чарнаватыя па жывапісе, хацелася б больш святла, мяккасці і пяшчотнасці ў каларыце. Гэта датычыць яго карцін «Гады выпрабаванняў», «Ля беларускіх бяроз» і «На пабыўцы». Так, напрыклад, у апошняй карціне, нават сама тэма якой вымагала звонкасці колераў, пакуль што гэтага не атрымалася. Хочацца спадзявацца, што І. Здзсенка пераадолее гэты недахоп свайго жывапісу.

Фатаграфіі на выстаўцы сучасныя па тэматыцы. Іх аўтары — К. Суботка і І. Гораў — праўдзіва паказваюць жыццё і побыт савецкіх воінаў. У К. Суботкі добрае жанравае фота «Мне пара...» — пра развітанне салдата з дзяўчынай, у І. Горава — «Праз дваццаць год» — ля брацкай магілы.

На жаль, на выстаўцы няма скульптуры, графікі ў матэрыяле (афорт, лінагравюра і інш.), разьбы па дрэву, плаката, карыкатуры і да т. п. Няма каталогу выстаўкі. Акварэльныя работы не афармлены як след (патрэбна шкло).

Засмучае і тое, што на выстаўцы пераважаюць у асноўным падрыхтоўчыя работы, пазбаўленыя сур'ёзнага ідэйна-мастацкага зместу. Хацелася б больш бачыць разнастайных закончаных тэматычных твораў самадзейных мастакоў-воінаў.

А гэта магчыма, калі Саюз мастакоў БССР і Палітупраўленне Беларускай ваеннай акругі будуць больш цесна звязаны, калі будзе існаваць паказальная студыя выяўленчага мастацтва пры Мінскім акруговым Доме афіцэраў. Існуючую студыю пры АДА пакуль што паказальнай лічыць нельга.

Мне думаецца, варта было б на базе гэтай выстаўкі правесці семінар усіх яе ўдзельнікаў сумесна з Саюзам мастакоў БССР, каб абмеркаваць шляхі паляпшэння далейшай работы з самадзейнымі мастакамі-воінамі.

М. ТАРАСІКАЎ,
старшы метадыст па выяўленчаму мастацтву Рэспубліканскага Дома народнай творчасці БССР.

НОВЫЯ СЕРЫІ ПАРТРЭТАЎ

Новую серыю партрэтаў рускіх і зарубежных кампазітараў выпусціла майстэрня Мастацкага фонду БССР. Рыхтуецца каля ста партрэтаў пісьменнікаў, дзеячоў навукі і тэхнікі, герояў грамадзянскай вайны.

Група мастакоў-графікаў закачвае работу над вялікай серыяй партрэтаў герояў—піянераў і камсамольцаў, якія аддалі жыццё за Радзіму, у барацьбе за яе свабоду і шчасце. Гэтую сваю працу беларускія графікі прысвячаюць надыходзячаму 20-годдзю з дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

БЕЛТА.



Вельмі рэдкую калекцыю паштовых марак мае пенсіянер з Рэчыцы Георгій Аляксандравіч Мухін. Ён сабраў іх каля 24 тысяч. Прычым каля пяцісот марак стогадовай даўнасці. Яны выпушчаны ў мінулым стагоддзі краінамі Амерыкі, Еўропы, Азіі, Афрыкі.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

«ПА ДАРОЗЕ НА ДНО»

Так называецца сцэнарый, напісаны Максімам Горкім у дваццатых гадах. У ім апавядаецца пра людзей, якія з'явіліся правобразамі герояў яго п'есы «На дне» — пра Луку і Сацінa. Сцэнарый М. Горкага да гэтага часу заставаўся не экранізаваным. А сёння на Горкаўскай тэлевізійнай студыі заканчваецца стварэнне тэлефільма па гэтым творы. Галоўны рэжысёр студыі Марк Скварцоў расказаў карэспандэнту АДН:

— Да здымкаў фільма прыцягнуты вялікі творчы калектыў. Ролю «будучага Лукі» выконвае артыст Горкаўскага тэатра драмы Вацлаў Дваржэцкі.

Фільм «Па дарозе на дно» складаецца з дзвюх частак. Першая ўжо адзнята. У бліжэйшы час будуць закончаны работы і над другой часткаю. Гледачы пазнаёмяцца з гэтым фільмам у сакавіку—да 97-й гадавіны з дня нараджэння М. Горкага.

АДН.

САЛАЎІНАЯ БЯРОСТА

У Ленінградзе ішоў занальны паказ Усерасійскага агляду сельскай мастацкай самадзейнасці. Адзін з нумароў выклікаў асаблівую цікавасць гледачоў. У праграме канцэрта Мурманскай вобласці было аб'яўлена: «Саратаўскія пераборы. Сола на бяросце выконвае Васіль Радайкін».

Што ж гэта за таямнічы інструмент?

Усе чакалі ўбачыць што-небудзь накшталт дудачкі або, прынамсі, неяк асабліва апрацаваны кавалачак дрэва. Але замест гэтага ў руках юнака паявілася танюсенькая стужачка берасцянай кары — тая самая, якой у вёсках печы распальваюць.

Нацягнуўшы стужачку, ён змясціў яе паміж губамі і ўцягнуў у сябе паветра. Палілася звонкая салаўіная песня. Салавей шчоўкаў, свістаў, заварожваў, і нават не верылася, што за акном шарэе зімовы ленінградскі дзень.

Пасля канцэрта я папрасіў Васіля расказаць, дзе і як ён навучыўся свайму майстэрству.

Два гады назад у далёкае сібірскае сяло, дзе жыў юнак, прыехалі ленінградскія артысты. На іх канцэрце Васіль і пачуў салаўіныя спевы на бяросце. Яму захацелася ў што б там ні было самому «стаць салаўём». Сталічны артыст ахвотна паказаў, як трэба іграць на гэтым нескладаным інструменце, які можна ў любой колькасці здабыць у лесе.

Інструмент якраз няхітры, а справа аказалася вельмі хітрай. Хочаце пераканацца, паспрабуйце пасвістаць на бярозавай кары. Нічога не атрымаецца. У Васіля пачаліся дні, тыдні і месяцы ўпартай працы. Спачатку трэба было навучыцца проста свістаць. А потым ён стаў падоўгу праседжваць на ўзлессі — і познім вечарам і золлім раннкам, падпільноўваючы салаўёў, запамінаў мелодыі іх песень. Так паступова і навучыўся...

Цяпер Васілю васемнаццаць гадоў. Бліжэйшыя планы матроса рыбалавецкага траўлера — навучыцца іграць на баяне, якім яго ўзнагародзілі ў Северарморску за поспехі ў мастацкай самадзейнасці.

Уладзімір ГОРСКІ.
(АДН).

Андрэй МАРУШАК

БЕЛАРУСКАЯ ВОСЕНЬ

У кастрычніку мінулага года ў складзе міжнароднай экскурсіі быў на Беларусі славацкі журналіст Андрэй Марушак. Сваімі ўражаннямі аб наведанні нашай рэспублікі ён падзяліўся на старонках браціслаўскай газеты «Праўда».

Прапануем увазе чытачоў яго нарыс са скарачэннямі.

Поезд, разразаючы цемру, ішоў на Захад. Немцы гаварылі пра нешта ўсе разам, і іх воклічы нагадвалі вайсковыя каманды. Венгры да позняй начы спявалі, і да іх мелодыі самі сабой напрошваліся славацкія словы. Мангалы маўчалі, балгары гулялі ў карты, чэхі і славакі ляглі спаць раней за ўсіх.

А раніцою край ахінула беларуская восень. Мокрыя вятры разносілі слёзы восені над барамі, трымцелі на балотах асінкі, агалілі свае стройныя ствалы бярозкі. На мінскіх плошчах з маладых пасляваенных ліп ападала лісце.

Мароз праходзіць па скуры, калі ўявіш нядолю тых незабыўных гадоў, якімі і цяпер жывуць удовы партызанкі. І ўспамінаецца увасобленае хаця б у чырвоных блыках з маладых садоў ...ных сталах...

...дні гучаць у маёй памяці ...чныя вершы Янкі Купалы, ...не магу прыгадаць іх даты. Але мне падабаюцца выдатныя імі вобразныя асацыяцыі, такія рэльефна матэрыяліза...ца на беларускай зямлі. Пяць дзён у асаблівым захапленні ...жу я па беларускіх нівах, кроку па мінскіх плошчах, захмялелы ад асалоды пазнавання...

А новыя далі вечна вабяць да сябе, абуджаючы неспакой. Хутка чаргуюцца капрызныя настроі восені — ад жаночага плачу да яснага бабінага лета, у якім жоўтыя ствалы дрэў гараць сярод апошняй зеляніны, нібы ахвярныя факелы багам урадлівасці. Блакітнае неба, рыжовае паветра, восень раскінула крывавыя плямы.

Драбналессе на сцюдзёных балотах, не надта шчодрыя палі наводзяць на думку пра бясконца доўгія неўрадлівыя гады. Вецер раздзімае жываты чорных кароў на беразе Нёмана, візенькі конік п'е з ракі Шчары.

На руінах крэпасці над Бугам час спыняецца. Ён застыў на руінах і не дае забыцца. У склепах пад Брэсцкай крэпасцю да гэтага часу трымаецца смурод гарэлага металу і чалавечага мяса, на сценах — чорныя пацёкі расплаўленага і скамянелага жалезабетону. Адламі крыху сабе і вазьмі гэтую памятку пра абаронцаў Брэста, якія сцякалі крывёй і не паддаліся жывымі, хоць немцы былі ўжо далёка за Мінскам.

Іван Іванавіч і Грэта агульнымі сіламі падразаюць крылы маёй фантазіі, вяртаючы на зямлю ўрачыста ўзвышаныя думкі.

Грэта — немка. У яе чысты, звонкі голас, і я амаль усё разумею ў яе гаворцы. Клауса я не разумею. Ён часта гаворыць «карашо» і ўвесь час прысвячае Грэце.

Іван Іванавіч перад вышэйшымі ўладамі адказны за ідэйна - палітычны ўзровень міжнароднай экскурсіі па беларускай зямлі. Яго дабрадушны твар часам хмурыцца, і мне здаецца, што дзеля пачуцця добра выкананага абавязку Іван Іванавіч зрэдку падлічвае нас, як важаты сваіх піянераў. У аўтобусе мы сядзім побач, яму дрэмлецца, а я паглынаю вачыма край. Чатырыста кіламетраў працягваецца ў нас забаўная гутарка.

— Прасторы неабсяжныя. Гэй, шырокія палі і раўніны, якое раздолле на вас для машын!

Шаша стралой бяжыць удалячынь. Будзе! Яшчэ лепшая будзе яна, гэтая шаша, ужо зараз яе пашыраюць.

□

У музеі Янкі Купалы я ўважліва прачытаў словы, якіх ніяк не мог успомніць. І арыгінал, і пераклад Горкага на рускую мову, і старое чэшскае гучанне з выразна рамантычным і, як мне здаецца, мілым русафільскім узлётам шляхетнай думкі нашых патрыётаў пачатку стагоддзя:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.

І паўстаюць, дапаўняючы верш, два вобразы, на фоне якіх ідуць праз стагоддзі беларусы. Адзін агорнуты чорным смуткам, прыгнечаны цяжарам стагоддзяў, што навіслі над балотамі беднай краіны, над людзьмі ў лахманах. Другі — увасабляе магутнае імкненне мас, свабодную працу з яснай мэтай. Вобразы і вершы ўладна абуджаюць у памяці ўсё вядомае па кнігах, пераплятаюць яго з радасцямі і болем перажытага асабіста.

Тут усё табе сплочвае любоўю за ўважлівасць, таварышы балгарын, немец, венгр! Зберажыце ў сваім сэрцы ўсё: ласкавую песню беларускіх вятроў і памяць аб закончаных класавых змаганнях, цёплыя поціскі рук і старую вартавую вежу ў беларускім полі, чорны хлеб з мёдам і шолах пажоўклых лістоў у старых летапісах.

А беларусы ідуць праз стагоддзі.

Крывічы, радзімічы, драўляне выходзяць з лясоў, п'юць мёд, утаймоўваюць дзікіх звяроў. Бунтуе «чорны люд» супраць літоўскіх баронаў, забівае польскіх паноў. Гінуць на шыбеніцах сялянскія правадыры — Налівайка, Галота, Вашчыла...

Беларусы ідуць праз стагоддзі. Душаць шведаў, што цягнуцца на Палтаву. Ламаюць цапы на французскіх касцях, мерзне Напалеон у сцюжы беларускай зімы. У Заходняй Еўропе расце ўжо набытак для мужнага веку. Босыя беларусы пракладваюць чыгункі, беларусы-лапцюжнікі ідуць да Кастрычніка праз стачкі на фабрыках, праз царскую катаргу.

Затрымайся, думка, бойся павярхоўнасці, не губляй пачуцця меры! Ад кніжнага вопыту ідзі ў сённешні дзень, у абноўленае жыццё... Глядзі, тут змешваюцца ўчарашнія і сённяшнія вобразы.

Выйшлі беларусы са спавітых дымам крэпасцей, з руін сваіх гарадоў, з зямлянак на балотах. Трэць народа фашысты перастралялі, павешалі, пахавалі пад руінамі. У мінскім Музеі Вялікай Айчыннай вайны побач з фатаграфіямі славакаў-партызан, сярод жахлівых сведчанняў фашысцкіх зверстваў ёсць адно найстрашнейшае: раструшчаныя прыкладамі, неперагарэлыя ў печах косці.

Жывыя беларусы сядзяць перад варотамі аднаго з вялікіх машынабудаўнічых заводаў. Юнакі курацъ папяросы. Кожны з іх чакае свайго старту. З канвеера кожныя пяць мінут сыходзіць чарговы трактар. Юнак дакурвае папяросу ўжо ў кабіне, за рулём. І ідуць трактары па беларускіх шляхах, паязды развозяць іх па ўсёй зямлі. Шэсцьдзесят тысяч трактараў у год, а будзе іх яшчэ больш — святая праўда ваша, Іван Іванавіч.

І не адзін толькі Іван Іванавіч, але і Павел Пятровіч, моцны саракагадовы здаравяка з шырокім тварам, падразае крылы папяровым узлётам маёй фантазіі. Можа не зусім дарэчы просяць яго расказаць пра сваё жыццё. І ён апавядае пра звычайны для савецкіх людзей лёс — сірата, бацькі былі непісьменныя, а ў сына — вышэйшая адукацыя, адказная пасада.

І зноў фантазія мая адпраўляецца ў палёт. На заводзе Паўла Пятровіча выпрабоўваюць новы тып грузавога аўта-тралейбуса. БелАЗ—марка надзейная.

І паслухмяная думка вяртаецца назад, на гэты раз на чвэрць стагоддзя назад. Дарэмна — тое, што было тады, наймацней адчуваецца пры жывым дотыку да сённяшняга кіпучага жыцця.

У Музеі Вялікай Айчыннай вайны мяне прывабілі на адной фатаграфіі вочы маладой жанчыны, якая паклала бомбу ў логава гітлераўскага камісара Вільгельма фон Кубэ. Гэтую гісторыю я памятаў па беларускаму кінафільму, які глядзеў некалькі год назад...

У Доме сувязей з заграніцай нас прывітала жанчына з журботнымі вачыма з Зоркай Героя Савецкага Саюза на цёмнай сукенцы. Яна маўчала, і было ў яе твары нешта такое, што чалавека ўцігхамірвала і адначасова ўзвышала. Потым яна расказвала аб гераічнай драме свайго народа, аб сваёй кроплі крыві ў акіяне вялікай вайны. Мы слухалі. Яна забіла Вільгельма фон Кубэ. Слабая жаночая рука сурова адпомсціла за сотні тысяч забітых, пакарала тырана, якога ўдзень і ўначы ахоўвала зграя забойцаў. І дапамагла жывым. Жывыя выпрасталіся, адважней пайшлі ў новы зацяты бой.

Чаго больш цяпер, праз гады, у гэтых успамінах? Горычы пры думцы аб жахлівым бяздонні, да якога апусцілася чалавецтва? Радасці ад вышыні, на якую ўзнялася высакароднасць, нягледзячы на бомбы і шыбеніцы?

Яна закончыла расказ тым, што было ў пачатку:

— Калі Мінск яшчэ гарэў, калі з руін яшчэ чуліся стогны, калі на пажарышчах яшчэ пахла гарэлым мясам, да мяне падышоў немец. Можа, гэта было на дзесяты дзень вайны, а, можа, на дваццаты. Я сяджу ў парку пад скалечаным дрэвам, плачу, галашу, хоць і баюся плакаць. Побач са мной — вузельчык з рэчамі — увесь мой скарб. Падышоў да мяне салдат, пагладзіў маю руку, а ў самога рука дрыжыць. Даў мне кавалак мыла, хлеба, нямецкія маркі. «Не плач, — кажа, — успомніш мае словы, беларуская дзяўчына: ты яшчэ сустрэнеш сапраўдных немцаў. Не плач», — кажа, а ў самога на вачах слёзы.

Немка Грэта абнімаецца з гераіняй. Абедзьве аднаго росту, толькі Грэта — тоненькая. Грэта ўзрушаная, уся трымціць, як асіна ў ціхую пагоду. І яе сэрца б'ецца на грудзях партызанкі трывожным набатам. Алена Рыгораўна Мазанік звяртаецца да Грэты па-нямецку:

— Супакойся, мілая дзяўчына! Я ж ужо сустрэла сапраўдных немцаў. Дабранач, дарагая!

...Мы працягваем рукі да вечнага агню на плошчы Перамогі. Гарыць агеньчык, гарыць у бетоннай чашы, надаючы плошчы і гораду асаблівую прывабнасць.

Мне не дае спакою вобраз зруйнаванага Мінска, мяне прыводзіць у лютасць фігура забойцы над руінамі, на касцях беларусаў. Не, нельга жыць сумленна, калі не ўспамінаць тое, што было...

Быў крывавы тэрор, быў зваротны ход гісторыі. І былі патрыёты, якія чэрпалі сваю мужнасць з народнага гневу. На ўскраіне Прагі яны кінулі бомбу ў крывавага ката Гейдрыха. Жыве, хоць і не ў добрым здароўі, партызанка, якая згасіла жыццё Вільгельма фон Кубэ.

Многа было баёў, многа герояў у беларускага народа. Цяпер у яго многа інтэлігенцыі, многа адукаваных людзей. Перанеслі крыўду «на худых плячах».

...А далі клічуць, вабяць, абуджаючы неспакой. Беларуская восень плача пад тужлівым ветрам, мякка ўсміхаецца пад блакітным небам, іскрыцца ўсімі барвамі.

Многія з беларусаў сталі мне знаёмымі, многія працягнулі мне руку дружбы. Алена Рыгораўна Мазанік напісала на адвароце сваёй ваеннай фотакарткі: «Добраму сябру маёй краіны».

Гэтае сяброўства трэба яшчэ заслужыць.

Пераклад са славацкай мовы.

Са сваёй песняй выступяць спевакі Мінскага падшыпнікавага завода на аглядзе мастацкай самадзейнасці. Называецца яна «Камсамольская». Словы напісаў шліфоўшчык Уладзімір Ран, а музыку — мастацкі кіраўнік харавога гуртка Пятро Бортнік.

На гэтым здымку, зробленым фотакарэспандэнтам М. Мінковічам, вы бачыце заводскіх спевакоў у час падрыхтоўкі новай песні. Злева направа — аператары Э. Карабцоў і П. Афанавіч, шліфоўшчыца С. Дземідзенка, слесар С. Карпман, токар Ул. Байкоў, капіроўшчыцы Л. Галыгіна і П. Бортнік.

ЛЁС МУЗЫКАНТА

У Варшаве 22 лютага адкрыўся VII Міжнародны конкурс піяністаў імя Фрэдэрыка Шапэна, у якім прымае ўдзел каля ста піяністаў з трыццаці краін Еўропы, Амерыкі і Азіі.

Савецкі Саюз прадставіць на конкурсе пяць піяністаў. У польскіх музычных колах лічаць, што сілы іх роўныя і кожны з іх можа прэтэндаваць на званне лаўрэата. Цікавы лёс аднаго з пяці—маладой літоўскай піяністкі Эстэры Елінайтэ.

Позняй восенню мінулага года ля Малой залы кансерваторыі віселі афішы «Усесаюзнае адборачнае праслухоўванне да Міжнароднага конкурсу імя Ф. Шапэна». У партэры сядзелі слухачы, а бельэтаж займала строгае журы. Туды больш нікога не пускалі. Журы слухала ігру маладых савецкіх піяністаў.

На сцэну выходзіць нумар 23 — тоненькая чарнавалосая дзяўчына. Гэта прадстаўніца Савецкай Літвы — Эстэра Елінайтэ.

Загучаў накцюрн Шапэна. Потым саната, скерца, эцюды... Рэгламент строгі. На кожнага выканаўцу адводзіцца паўгадзіны. Я зайшоў за кулісы, каб падзякаваць Эстэры за яе ігру, і застаў тут члена журы, кіеўскую піяністку Лысенка, якая абдымала Эстэру і гаварыла: «Дзетачка! Ды якая ж ты мілая!» Вось табе і музычная Феміда. Аказваецца, члены журы могуць не толькі ставіць адзнакі ў сваіх блакнотах, але і вось так прыбягаць за сцэну.

Хутка журы абвясціла сваё рашэнне — пяць маладых савецкіх піяністаў едуць у Варшаву. Сярод іх Эстэра Елінайтэ.

Мая другая сустрэча з маладой піяністкай адбылася ў студзені 1965 года ў Каўнасе пасля яе канцэрта. Яна зноў іграла Шапэна. Эстэра згадзілася паказаць мне горад, пазнаёміць з яго людзьмі. Яна сумленна выконвала абавязкі гіда, паказвала, расказвала, а я слухаў і глядзеў.

Калі ўлетку 1941 года нацысты захапілі Літву, Эстэры Елінайтэ было 10 месяцаў. Елінас і яго жонка Елінене, спрабуючы выратавацца ад рэпрэсій, пакінулі Каўнас, захапіўшы з сабою маленькую дачку. Але дарогі былі перарэзаны і ім давялося вярнуцца назад.

Раён Вільямполе. Тут гета. І на ўсіх яго жыхарах як кляймо — жоўтая шасціканцовая зорка. Тут яны сустрэлі новы, 1942 год. Вось фатаграфія Эстэры Елінайтэ тых гадоў: чарнавокая, чарнавалосая дзяўчынка, увянчаная вялізным папяровым бантам. На сукенчыцы жоўтая зорка.

Пачатак 1942 года быў трывожны: пачаліся масавыя рэпрэсіі. Елінене, баючыся за жыццё дачкі, вынесла яе за калючы дрот у горад. Сарваўшы ненавісны знак з адзення, яна прайшла па вуліцах і ўладкавала дзяўчынку ў адной літоўскай сям'і, якая на працягу двух месяцаў хавала ў сябе дзіця. Потым стала небяспечна: паліцыя сёе-тое пранюхала. І тады Елінене зноў выйшла з гета і, не знайшоўшы іншага бяспечнага месца, удзень, на вачах ва ўсіх вярнулася разам з дзіцем за калючы дрот. Ахова не заўважыла, а між тым толькі за самавольны выхад з гета належаў расстрэл.

У студзені 1942 года ў Каўнаскім гета была створана падпольная арганізацыя. Душою яе стаў камуніст Хаім Елінас, дзядзька Эстэры Елінайтэ. Ён увайшоў у склад падпольнага гаркома партыі і наладзіў сувязь з партызанамі ў лясах. Гэта быў чалавек надзвычайнай смеласці. Не адна аперацыя па перапраўцы людзей, медыкаментаў і зброі ў лес, знішчэнні фашыстаў і здраднікаў-паліцаяў была праведзена пад яго кіраўніцтвам. Ён загінуў як герой за месяц да вызвалення Каўнаса Савецкай Арміяй.

Аж да кастрычніка 1943 года Эстэра знаходзілася з бацькамі ў гета. Сярод зняволеных быў скрыпач Карманас. Іншы раз ён браў скрыпку і ціха іграў. Эся ўважліва слухала. Аднойчы яна праспявала тое, што ён іграў. Скрыпач быў здзіўлены дакладнасцю паўтарэння. Яны пачалі часта практыкавацца.

Фронт набліжаўся да Літвы, партызаны павялічылі сваю актыўнасць. Гітлераўцы, адчуваючы свой канец, лютавалі. Узнікла небяспека поўнага знішчэння каўнаскага гета. Елінене зноў вынесла Эстэру праз дрот у горад. Яна пайшла на вуліцу Жэмайча, дзе жыла сям'я вялікага літоўскага мастака і кампазітара Чурліёніса. Да яе і звярнулася Елінене ў кастрычніку 1943 года з просьбаю прытуліць дзіця. Сямейная нарада была кароткая. На ўсялякі выпадак дзяўчынку змясцілі ў падвальным пакоі (як высветлілася потым, яшчэ некалькі чалавек былі выратаваны Чурліёнісамі такім жа чынам).

Шпікі гестапа шнырылі побач. Таму Чурліёнісы хутка вымушаны былі ўладкаваць Эстэру пад выглядам сваёй сваячкі ў дзіцячы дом пры манастыры святога Бенедзікціна.

Савецкая Армія ў жніўні 1944 года вызваліла Каўнас ад фашыстаў. Пачалося мірнае жыццё. Эстэра стала вучыцца ігры на фартэпіяна. Першыя тры класы у Каўнаскай музычнай школе. Потым пераезд у Вільнюс. Тут, у класе прафесара Якава Гінзбурга, Эстэра займалася так паспяхова, што ў 1954 годзе яна прыняла ўдзел у Дэкадзе літоўскай літаратуры і мастацтва ў Маскве. Самая юная ўдзельніца Дэкады трынаццацігадовая піяністка Эстэра Елінайтэ выконвала Патэтычную санату Бетховена, эцюды Ліста. У 1958 годзе Эстэра паступіла ў Маскоўскую кансерваторыю па класу прафесара Генрыха Нейгауза і скончыла яе ў 1963 годзе. Цяпер яна вучыцца ў аспірантуры.

Алег БАРЫСАЎ.
(АДН).

Па той бок

НА ПАТРЭБУ БІЗНЕСУ

У Сан-Рэма закончыўся 15-ты фестываль эстраднай песні — самы буйны са многіх дзесяткаў конкурсаў такога роду, што праводзіліся ў Італіі. Канцэртная зала мясцовага казіно абязлюдзела, і яе будынак зноў цалкам апынуўся ў распараджэнні тых марнатраўцаў жыцця, якія прыязджаюць у гэты курортны гарадок з розных краін, каб пагуляць у рулетку.

Фестываль песні ў Сан-Рэма закончыўся перамогаю дзевятнаццацігадовага рымскага спевака Бобі Сола, які выканаў песню «Калі плачаш, калі смяешся».

У цэлым крытыкі, якія імкнуцца даць аб'ектыўную ацэнку, лічаць, што фестываль «быў на рэдкасць бедны». «Перамогаю дрэннага густу» назваля яго газета «Аванці». «Праграма банальная і пасрэдная, ніводнага свежага новага матыву», — піша газета «Попала».

Сапраўды, глядач, які ўпершыню наведаў канцэртную залу сан-рэмскага казіно і шмат чуў пра музычнасць італьянцаў і іх любоў да добрай песні, дзівіцца, чаму песні, прадстаўленыя на конкурсе, такія банальныя і стэрэатыпныя. Аднак, адказ просты. Справа ў тым, што сапраўднымі гаспадарамі фестывалю, што вызначалі, якія іменна песні павінны быць прадстаўлены на конкурсе, былі камерсанты, дзялкі, што стаяць на чале кампаній, якія выпускаюць грамафонныя пласцінкі.

Іменна яны з'яўляюцца сапраўднымі пераможцамі фестывалю Сан-Рэма. Як піша газета «Паэзе сера», яны падзялілі паміж сабою навалкі пірага Сан-Рэма, начынкаю якога служаць асігнацыі з многімі і многімі нулямі. Фестываль у Сан-Рэма, паводле сведчання раду італьянскіх газет, абяцае кампаніям, што займаюцца выпускам пласцінак эстраднай музыкі, прынамсі тры мільярды лір. Лічба вельмі паважная. Як піша газета «Аванці», індустрыя лёгкай музыкі ўваходзіць у лік першых дзесяці галін італьянскай прамысловасці па тых сродках, якімі яна арудуе.

В. ГАНЧАРОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

г. Рым.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

23 лютага

Першая праграма 15.55 — праграма перадач. 16.00 — «Крылатыя салдаты». Прэм'ера дакументальнага фільма Беларускага тэлебачання. 16.30 — «На варце любімай Айчыны». Перадача з Ленінграда. 17.30 — тэлевізійныя навіны. 17.50 — канцэрт па просьбах воінаў Беларускай ваеннай акругі. 19.00 — «Выклікаем агонь на сябе». Прэм'ера тэлефільма. 4-я серыя (М). 20.40 — «Юнацтва баявое». Святочны выпуск тэлевізійнага часопіса. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «Мы помнім дарогі...» Сустрэча пісьменнікаў, акцёраў, рэжысёраў, кампазітараў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (М).

Другая праграма. 17.30 — для дзяцей. «Дружныя рабяты». Перадача з Ленінграда. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Час і людзі». Тэлевізійны летапіс (М). 19.00 — «Героі не паміраюць». Дакументальны фільм. 19.50 — «Сёння звальнення не будзе». Кароткаметражны фільм. 20.40 — «Па вашых заяўках, таварышы воіны». Канцэрт (М).

24 лютага

Першая праграма. 12.00 — для школьнікаў. Канцэрт харавой капэлы хлопчыкаў (М). 14.55 — першынство свету па ханею з мячом. СССР — Нарвегія. Перадача з Свярдлоўска. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для дзяцей «Чытаюць юныя». Б. Заходар. «Мартыцкін дом». 17.15 — насустрач выбарам у мясцовыя Саветы. «Два светы — дзве дэмакратыі». Гутарка кандыдата юрыдычных навук Ю. Смірнова. 17.35 — музычны антракт. 17.40 — тэлевізійныя навіны. 18.00 — для юнацтва. «Шукальнікі». Тэлевізійны клуб (М). 19.00 — да 20-годдзя перамогі над фашысцкай Германіяй. І. Тарасаў. «Гета было ў Магілёве». Спектакль Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «У эфіры — «Маладосць». «Табе, дапытлівы» (М).

Другая праграма. 16.55 — праграма перадач (М). 17.00 — для школьнікаў «У тайны жывога» (М). 17.30 — «Вінцік і Шпунцік — вясёлыя майстры». Мультыплікацыйны фільм (М). 17.50 — тэлевізійныя навіны (М). 18.00 — для дзяцей. Кароткаметражныя фільмы. «Мядзведжы цырк». «Дзяўчынка і сонечны зайчык». 18.45— «Вялікае сэрца». Кінанарыс. 19.00 — «Свет сёння» (М). 19.40— «Майстры мастацтва». Заслужаны артыст РСФСР А. Папанаў. Перадача з Цэнтральнага Дома акцёра (М). 21.30 — канцэрт сімфанічнай музыкі.

25 лютага

Першая праграма. 16.40 — праграма перадач. 16.45—для школьнікаў. «Архівярыус». Трансляцыя на Маскву. 17.30 — для малышоў. «Снегавік-паштавік». Мультыплікацыйны фільм. 17.50 — тэлевізійныя навіны. 18.10 — «Дружба». Савецка-чэхаславацкі часопіс. Першы нумар. Перадача з Прагі. 19.00 — універсітэт педагагічных ведаў. «Дзіця выхоўваецца ў калектыве». 19.45 — «Майстры мастацтва». Творчы партрэт французскага кінажурналіста Рэнэ Клемана (М). 21.30 — эстафета навін (М). 22.50 — канцэрт (М).

Другая праграма. 17.30 — «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — героі нашага часу. Кінанарысы «Неспакойны характар». «Вогненныя кветкі». 19.00 — «Савецкая Расія». Рэпартаж з выстаўкі мастакоў Р